ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Літаратура і мастацтва

№ 19

8 кастрычніка 1932 г.

г. Менск

Цана асобнага нумару 5 кап.

Орган арганізацыйнага камітэту саюзу савецкіх пісьменьнікаў і Галоўмастацтва БССР

Прывітаньне ЦК УсеКП(б) Максіму Горкаму

ЦК УсеКП(б) горача вітае вялікага пралетарскага пісьменьніка Максіма Горкага.

Сваімі выдатнымі мастацкімі творамі, якія зрабіліся здабыткам мільёнаў мас, Горкі «моцна зьвязаў сябе з рабочым рухам Расіі і ўсяго сьвету» (Ленін).

Імя Максіма Горкага дорага і блізка працоўным савецкай краіны і залёка за яе межамі, як імя найвялікшага мастака-рэвалюцыянэра, змагара супраць царызму, супраць капіталізму, за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю, за вызваленьне працоўных усіх краін з пад ярма капіталізму.

ЦК УсеКП(б) выказвае ўпэўненасьць, што вялікі талент Горкага і яго рэвалюцыйная энэргія будуць яшчэ доўга служыць справе рабочае клясы.

ЦК УсеКП(б).

Прывітаньне таварыша Сталіна

Дарагі Аляксей Максімавіч!

Ад душы вітаю Вас і моцнаціску руку. Жадаю Вам доўгіх гадоў жыцьця і работы на радасьць усіх працоўных, на страх ворагам рабочае клясы.

І. СТАЛІН.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР пра ўзнагароджаньне ордэнам Леніна таварыша Максіма Горкага

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР пастанаўляе:

Узнагарадзіць ордэнам Леніна вялікага пралетарскага пісьменьніка таварыша Максіма Горкага за яго літаратурныя заслугі перад рабочай клясай і працоўнымі Саюзу ССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР А. ЕНУКІДЗЭ.

Масква, Крэмль, 17 верасьня 1932 г.

Горкаўскія дні на Беларусі

МЕНСК

▲ 23-га верасьня адбыўся вялікі літаратурны вечар у Доме Працасьветы. З дакладам пра творчы і жыцьцёвы шлях Максіма Горкага выступіў тав. М. Аляхновіч.

▲ Аб'яднанае паседжаньне Акадэмічнага Савету БАН, Аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў і ЦБ сэкцыі навуковых работнікаў адбылося 2-га кастрычніка ў залі Дому Камасьветы. З вялікімі дакладамі пра Максіма Горкага выступілі акадэмікі І. І. Замоцін і С. Я. Вальфсон.

Народны паэта рэспублікі Янка Купала зачытаў прывітаньне Максіму Горкаму. Пісьменьнікі Ліхадзіеўскі, Шапавалаў і Андрэй Александровіч выступілі з чыткай уласных твораў.

▲ Вялізарны вечар, прысьвечаны юбілею Максіма Горкага, які адбыўся ў памяшканьні Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатру адкрыў Намесьнік Наркома Асьветы тав. Бялуга. З дакладам пра творчасьць юбіляра выступіў першы віцэпрэзыдэнт Акадэміі Навук тав. Домбаль. З прывітальнымі прамовамі выступілі т. т. Чарнушэвіч і Лынькоў.

▲ На заводзе «Пралетары» брыгада пісьменьнікаў у складзе Р. Кобеца, А. Вольнага, М. Хведаровіча і Барыса Мікуліча 26-га верасьня правяла вечар, прысьвечаны Максіму Горкаму. На вечары ўдарныя брыгады прысвоілі сабе імя Максіма Горкага.

МАГІЛЕЎ

▲ Літаратурныя вечары ў Магілеве былі арганізаваны парткалектывам і фабкомам фабрыкі штучнага шоўку, райкомам КП(б)Б, райкомам ЛКСМ, райпрафсаветам і рэдакцыяй газэты «Камунар Магілеўшчыны»; у Пэдінстытуце заслухан цэлы шэраг дакладаў пра Максіма Горкага; арганізавана выстаўка ў бібліатэцы імя Карла Маркса, якая паказвае шлях у змаганьні Максіма Горкага; дбыліся ранішнікі ва ўсіх школах гораду і раёну.

ГОМЕЛЬ

▲ Вялізарную аўдыторыю сабраў урачысты вечар, прысьвечаны Максіму Горкаму, які адбыўся ў гомельскім цырку. На вечары выступілі пісьменьнікі Рыгор Кобец, Анатоль Вольны і Мікола Хведаровіч.

Максім Горкі сярод пагранічнікаў

Рыхтуемся да Кастрычніка

Гэтымі днямі адбылася нарада пісьменьнікаў і крытыкаў, прысьвечаная падрыхтоўцы да XV гадавіны Кастрычніка. На нарадзе шырока абмяркоўвалася пытаньне пра падрыхтоўку адпаведных артыкулаў і матар'ялаў для нашых газэт і часопісаў, прысьвечаных літаратурнаму руху БССР за 15 год. Папярэдняе разьмеркаваньне тэм наступнае: масавы літаратурны рух—т. Куніцкі, літаратурная крытыка за 15 год—т. Сідарэнка, абаронная тэматыка ў беларускай літаратуры—т. Галубок, камсамол у беларускай савецкай літаратуры—тав. Ляпіч, агляд паэзіі за 15 год—т. Аляхновіч, артыкул пра Платона Галавача—т. Шарахоўскі, пра творчасьць рабочага-ударніка Шнэйдэля—т. Селіванава, агляд яўрэйскай савецкай літаратуры—т. Дунец і Браншчтэйн, літаратура Заходняй Беларусі—т. т. Дварчанін і Салагуб.

Пішуцца артыкулы Плашчынскім, Пятровічам, Коберам, Барысёнкам, Ільлінскім, Цітовым.

Рыхтуецца кніга пра беларускую савецкую літаратуру за 15 год.

У наступным нумары нашай газэты будзе дадзена зводка пра стан работы над гэтымі матар' яламі.

Усебеларускі зьезд савецкіх пісьменьнікаў

Апошнія два паседжаньні Аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР былі прысьвечаны галоўным чынам пытаньню падрыхтоўкі да Ўсебеларускага зьезду савецкіх пісьменьнікаў.

З інфармацыяй аб зьезьдзе выступіў адказны сэкратар Аргкамітэту тав. Лынькоў.

Зьезд мяркуецца склікаць 25-га кастрычніка г. г. Арыентыровачная абвестка дня наступная: агульны палітычны даклад, справаздача Аргкамітэту, даклад на творчыя пытаньні. Дакладчыкам па творчых пытаньнях вызначан тав. Браншчтэйн.

Складзены камісіі для правядзеньня падрыхтоўкі да зьезду: арганізацыйная ў складзе т. т. Вольнага, Кацовіча, Барашкі, Крапівы, Таўбіна, рэдакцыйная ў складзе т. т.: Галавача, Ліманоўскага, Юдэльсона, Шапавалава і Ц. Гартнага, выставачная ў складзе т. т. Бядулі, Зарэцкага, Мурашкі, Сташэўскага, Рымашэўскага, Хадыкі, Стэльмаха, Бацюшкова, Доўгапольскага, Аксельрода, Лібэрмана і Ільлінскага.

Пісьменьнікі за работай

▲ Аповесьць на тэму перароблкі людзей у працэсах сацыялістычнай вытворчасьці, пра барацьбу камсамольцаў-тарфянікаў за энэргічную базу, пра пытаньні бытавых узаемаадосін сярод працоўнай моладзі пад назваю «Сэзоньнікі» піша пісьменьнік Пятрусь Броўка.

▲ Уладзімер Хадыка здаў у друк кнігу лірыкі «Глыбокая рочаць», у якой сабраны вершы за пэрыяд 1927-31 г. г.

▲ Платон Галавач працуе над буйным раманам «Праз гады». Пісьменьнікам закончана першая частка гэтага раману.

▲ Кіно-сцэнары паводле свайго раману «Вязьмо» напісаў Міхась Зарэцкі. У сучасны момант працуе над перакладам раману Максіма Горкага «Справа Артамонавых».

▲ Друкуецца паэма Ів. Шапавалава «Ян Рендя». Кніга аформлена мастакамі Тарасам і Сокалавым.

▲ Сьцяпан Ліхадзіеўскі працуе над кнігай нарысаў пра лінкор «Парыская камуна».

▲ Р. КОБЕЦ напісаў п'есу «Чаму-ж мне ня пець», якая ставіцца ў тэатры Чырвонай Арміі.

Пісьменьнік Давід Бергельсон у Менску

Менск наведаў буйнейшы яўрэйскі пісьменьнік тав. Давід Бергельсон, які жывае за апошні час у Бэрліне.

Тав. Бергельсон выдрукаваў ў Савецкім Саюзе новы свой раман «Ля Дняпра»—першы том задуманай трылёгіі, які па-майстэрску адлюстроўвае нарастаньне клясавай барацьбы напярэдадні рэвалюцыі пятага году. У гэтай кнізе з выключным майстэрствам падведзены вобразы яўрэйскай местачковай беднаты.

Яўрэйская буржуазная прэса за мяжой сустрэла на штыхі гэтую новую кнігу Бергельсона, закляйміўшы яе як «тэндэнцыйна-рэвалюцыйны» твор.

Тав. Бергельсон у шэрагу сваіх апошніх публіцыстычных артыкулаў даў рэзкі адпор інтэрвэнцыяніцкаму яўрэйскаму друку, які распаўсюджвае паклёпы супроць Савецкага Саюзу.

У Савецкім Саюзе тав. Бергельсон прабудзе значны час. З Менску пісьменьнік едзе ў Біра-Біджан па заданьню яўрэйскай газэты компарты ЗАЗШ «Морген Фрайгайт».

У Менску з удзелам тав. Бергельсона арганізаваны шэраг вечароў. Першы вечар адбыўся 30-га верасьня ў Цэнтральным яўрэйскім рабочым клюбе імя Леніна. Гарачую сустрэчу наладзілі пісьменьніку ў яўрэйскім дзяржаўным тэатры, дзе была паказана яго п'еса «Глухі».

Пісьменьніцкая і мастацкая грамадзкасьць г. Менску арганізавала тав. Бергельсону таварыскую сустрэчу, якая адбылася 3-га кастрычніка ў Доме Пісьменьніка.

Там—заняпад і зруйнаваньне, тут—росквіт і рост

(З гутаркі з тав. Бергельсонам)

Тав. Бергельсон жыў у апошні час у Бэрліне, які зьяўляецца адным з замежных цэнтраў белай эміграцыі з яе яўрэйскай чорнай сотняй. За гэтыя гады так выразны сталі перамогі сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе, гіганцкія дасягненьні пяцігадовага пляну, які патрасальна паловае сусьветны капіталізм і зьяўляецца рэвалюцыйным гонарам пралетарыяту ўсяго сьвету. У супрацьлегласьць —капіталізм перажывае нявылечны крызіс, які ня толькі зьнішчае часовую стабілізацыю, але прыносіць усё новыя і новыя крахі і палітычна-сацыяльныя патрасеньні.

Надзвычайна цікавамі і знамянаўчымі, кажа тав. Бергельсон, зьяўляюцца адносіны да Савецкага Саюзу, да посьпехаў пяцігадовага пляну. У буржуазным лягеры посьпехі плянавай сацыялістычнай гаспадаркі выклікалі і выклікаюць пярэпалах. Зьвярыная злосьць ахапіла буржуазію, яна ўсімі магчымасьцямі намагаецца затхнуць перамогі Савецкай дзяржавы ад шырокіх рабочых мас. Разам з гэтым адбываецца ныбачаная глыбокая дыфэрэнцыяцыя ў грамадзтве, нараджэнца сябры і ворагі пралетарскай дзяржавы, вялікія зьмены ў настроях сярод інтэлігенцыі. Ліхаманкава працуе «прэса дзяржава»—прэса з яе прыдзінымі сабарыкатарамі паклёпаў і маны сусьветнага маштабу.

Тав. Бергельсон пераводзіць гутарку на становішча ў асяродзьдзі яўрэйскай інтэлігенцыі за мяжой, з якім яму прышлося сутыкнуцца, змагацца і нажыць сабе ворагаў асабліва з яўрэйскіх нацыянал-і сацыял-фашыстаў у Польшчы, Нямеччыне і Амэрыцы.

Яўрэйская буржуазная інтэлігенцыя за мяжой—кажа тав. Бергельсон—займае сваё месца ў агульным лягеры фашызму. Ужо з першых гадоў існаваньня Савецкага Саюзу яна занялася раздуваньнем цяжкасьцяў сацыялістычнага будаўніцтва. На гэтай аснове складзена моцнае яднаньне паміж імі і буржуазнай яўрэйскай прэсай. Амэрыканскі «Форвэртс», «Тог», «Моргн журнал» маюць у Бэрліне цэлы штат карэспандэнтаў спэцыяльна для таго, каб атрымаць весткі, якія кампрамэнтуюць Савецкі Саюз. Пры гэтым газэты не дадаюць таго, што ім самім прыдзецца заўтра гэтую хлусьню абвяргнуць. Гэтыя карэспандэнты вельмі добра аплочваецца. Яны бегаюць, як дзікія сабакі, нюхаюць, шукаюць якога-небудзь паклёпу і ўжо ляцяць тэлеграмы і хлусьлівыя карэспандэнцыі да іхных шэфаў прэсы. За меншую плату яны перадаюць гэтыя самыя весткі яўрэйскай буржуазнай прэсе Варшавы, Рыгі і інш.

Гэтыя карэспандэнты бытуюць сярод галоўных кадраў яўрэйскіх нацыяналістаў (частка з іх—белыя эмігранты). Яны працуюць аднамасова ў агульнай буржуазнай прэсе. У яўрэйскай буржуазнай прэсе яны абслугоўваюць, галоўным чынам, сэктар нацыянальнай культуры, прыкрываючыся плашчам навукі і адданасьці яўрэйскай культуры і мове.

«Найвышэйшаю трыбунаю» зьяўляецца часопіс «Ідыш» у Амэрыцы. У яго рэдакцыі бяруць удзел апрача заўзятага ворага Савецкага Саюзу—Жытлоўскага яшчэ і Лэйвік Лэйвік вы стаўляецца пры гэтым непадкупным прыяцелем пралетарыяту.

Росквіт яўрэйскай культуры, тэатру, літаратуры ў Савецкім Саюзе; упартая праца і рашучае жаданьне пабудаваць сацыялістычны Біра-Біджан,—гэта самыя цяжкія удары для гэтых людзей, удары, якія даводзяць іх да страты сьвядомасьці, да зьбянтэжанасьці і панікі, што прыводзіць іх да выдумак новых хлусьлівых чутак пра Саюз Саветаў, асабліва пра эканамічнае і культурнае жыцьцё яўрэйскіх рабочых і працоўных Савецкага Саюзу. Паказаць становішча яўрэйскае буржуазіі, нацыяналістычна і сацыял-фашысцкай інтэлігенцыі за мяжой—кажа тав. Бергельсон,—можна толькі наступнымі параўнаньнямі:

З аднаго боку: — поўнае зруйнаваньне яўрэйскіх мас ня толькі ў Польшчы, Румыніі, Латвіі і інш., але таксама ў былой блаславёнай Амэрыцы, заняпад яўрэйскіх нацыянальных школ у Польшчы, у якіх трацяць прытомнасьць з голаду вучні; заняпад яўрэйскага тэатру ў Польшчы, ліквідацыя яўрэйскіх выдавецтваў (самае большае выдавецтва Клецкіна ліквідавана, вялікі кніжны магазын «Кніга» зачынены і г. д.).

Ні адзін часопіс не дасягае 10—15 нумароў. Апошнія бяскроўныя часопісы «Літэрарішэ блеттер» і «Ідыш» у Амэрыцы б'юць кожны дзень трывогу. Там гінуць лепшыя таленты, як Вайнпэр, Варшаўскі, Фукс, Кадзі, Малалоўская, за апошні час ня прыбываюць новыя літаратурныя сілы.

З другога боку: разьвіцьцё і паглыбленьне яўрэйскае пралетарскае навукі ў Савецкім Саюзе; рост колькасьці яўрэйскіх ніжэйшых, сярэдніх і вышэйшых школ, навукова-дасьледчых установ, рост вялікіх яўрэйскіх тэатраў ува ўсіх вялікіх гарадох Саюзу; рост тыражу газэт, росквіт яўрэйскае савецкае літаратуры, мастацкі рост яўрэйскіх пісьменьнікаў і тэатраў. Можна назваць такіх пісьменьнікаў, як Фэфэр, Альбэртон і інш.

Росквіт новых вялікіх талентаў, як М. Лур'е, Э. Гардрон і інш.; вялікі творчы рост паэта І. Харыка; Разьвіцьцё П. Маркіша. Той факт, што Кульбак, талент якога яўрэйская мяшчанская атмасфэра ў Польшчы душыла, цяпер расьце ў Савецкім Саюзе. І гэта ўсё адбываецца на базе нячуванага эканамічнага росквіту яўрэйскіх працоўных мас у Сав. Саюзе разам з працоўнымі іншых нацыянальнасьцяў, узмацненьне калектывізацыі ў Крыме і пераможнае будаўніцтва сацыялістычнага Біра-Біджану.

Усё гэта вядзе да таго, што самыя здольныя яўрэйскія сілы за мяжой рвуцца з мяшчанскага балота, зьвязваюцца з рэвалюцыйным пралетарыятам, уключаюцца ў яго шэрагі, ураставоць у яго творчасьць.

Расьце і набывае з дня на дзень больш чытачоў камуністычная газэта Амэрыкі «Морген Фрайгайт»; цэлы шэраг яўрэйскіх пралетарскіх часопісаў у Паўднёвай Амэрыцы, Канадзе, Аргентыне, Францыі, Польшчы. Расьце ўвесь час колькасьць членаў у інтэрнацыянальным рабочым ордэне ў Амэрыцы «Артэф» (пралетарскі тэатр), узрастаюць новыя мастацкія таленты, адзін з іх гэта моцны талент Зіскінд Леў, якога буржуазная крытыка вымушана прызнаць. Гэта ўсё знакі рэвалюцыйнага нарастаньня ў яўрэйскіх рабочых і працоўных, якія вядуць змаганьне пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі за перамогу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Тав. Бэргельсон дзеліцца нарэшце сваімі плянамі і тлумачыць мэту свайго прыезду ў СССР. Т. Бэргельсон прыехаў як спэцыяльны карэспандэнт газэты «Морген фрайгайт». Зараз ён мае паехаць у Біра-Біджан.

Пра ўсё новае, што я пабачыў у Сав. Саюзе,—канчае т. Бэргельсон,—мне яшчэ ня раз прыдзецца гаварыць у яўрэйскай камуністычнай прэсе.

Мацней агонь па „старых традыцыях“

Гістарычнае рашэньне ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый паслужыла моцным штуршком ў справе творчай мабілізацыі нашых кадраў. Мейсца «заседательской суетни», характэрнай рапаўскай крыклівасьці заняла творчая работа побач з шэрагам мерапрыемстваў па арганізацыйнай перабудове літаратурнай работы паводле рашэньня ЦК.

Гэтыя зрухі бязумоўна моцна даюць сябе адчуваць таксама ў шэрагах савецкіх пісьменьнікаў БССР.

Увесь творчы ... канчае шэраг рэчаў, якія абяцаюць быць укладам у сацыялістычную культуру нашай краіны. Ёсьць уздым і ў галіне драматургіі. Ёсьць зрух у масавай працы.

Зусім зразумела, калі падвесьці вынікі работы Аргкамітэту БССР, дык выявіцца шмат прарываў у яго дзейнасьці. Гэта асабліва будзе выяўляцца на рабоце літгурткоў: слаба абслугоўваюцца гурткі, яшчэ ня выпрацавана праграма.

Таксама нельга лічыць здавальняючай сувязь з КСМ і разгортваньне творчай дыскусіі маладзёжнай літаратуры.

Няма таксама дастатковай апэрацыйнасьці і плянавасьці ў рабоце газэты «ЛіМ».

Далёка не дастаткова разгорнута творчая дыскусія, яна амаль заглухла за летні пэрыяд. І цэлы шэраг іншых недахопаў. Пра гэтыя недахопы неабходна яшчэ і яшчэ напомніць, з тым, каб іх выжыць. Шырэй крытыку і самакрытыку гэтых недахопаў!

Аднак неабходна даць адпор тым «прысяжным ныцікам», што любяць усё бачыць праз чорныя акуляры, якія плачуць, што «нічога не атрымліваецца», што «нічога не зьмянілася апрача шыльды, што «нічога наогул ня робіцца». Гэтыя ныцікі плачуць пра «добры стары час», нагадваюць «времена оные», калі жыў БелАПП, «папраўляюць» таварышоў, калі тыя паправу кажуць пра дрэнныя традыцыі АПП. Да гэтага-ж разраду належаць тыя, якія ўсякую толькі што вышаўшую за апошні час кніжку, асабліва маладога, пісьменьніка, гатовы ахаяць, ачарніць, а маладога аўтара «обработат в два счета». У асяродзьдзі гэтых таварышоў жывуць яшчэ тыя добрыя «старыя традыцыі», калі на кожнага нештампэлёванага яшчэ ні пралетарскім, ні саюзьніцкім імем глядзяць падазронна, з-пад ілба.

Гэтыя людзі зразумелі, што партыя зараз не дазволіць таптаць у гразь савецкіх мастакоў, яны зразумелі, што выбраць цэльлю шальмаванньня замапаваўшыхся ўжо савецкіх пісьменьнікаў ніхто ім не дазволіць, і вось яны сваёй мэтай выбіраюць новую падрастаючую фалангу пісьменьнікаў. Толькі так можна расцэньваць абураючыя выступленьні за апошні час пра нарысы і кнігі тав. Скрыгана, Мікуліча, Шапавалава і інш.

Мы заяўляем, што такі падыход карэнным чынам разыходзіцца з пастановамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б. Гэтыя пастановы патрабуюць ад нас барацьбы за пісьменьніка, што імкнецца служыць сваёй работай сацыялістычнаму будаўніцтву. А ці-ж не да гэтага разраду належаць такія пісьменьнікі, як Скрыган, Мікуліч, Шапавалаў? Ці-ж не зьяўляецца абураючай лёгкасьць абрашчэньня некаторых таварышоў з нашым маладняком? Ці-ж гэта ня ёсьць аплёўваньне дырэктыў партыі па стварэньню і ўзрошчваньню нашых пісьменьніцкіх кадраў, што зьяўляецца надзвычай важным, асабліва ў нашых умовах нацыянальнай рэспублікі?

Партыя патрабуе ад нас рашучага павярнуцца да масы савецкіх работнікаў літаратуры і мастацтва, выжыць групаўшчыну—гэтыя «традыцыі» былога РАПП'у і ВОАПП'у. Аднак, ёсьць яшчэ ў нас такія, якія трасуцца пры кожным успаміне пра РАПП: «А мо' хто-небудзь крытычна загаворыць пра «спадчыну». Ніхто ня думаецца адмаўляць якія-небудзь істотныя заслугі той ці іншай арганізацыі, існаваўшай раней і працаваўшай на карысьць генэральнай лініі партыі. Але калі «трымаюцца за фалды РАПП'у, калі адыходзяць ад актыўнай работы, калі становяцца з боку ад работы ў якасьці наглядальніка-скэптыка і «созерцают заднюю историю», альбо хныкаюць па ўчарашнім дню, ім варта напомніць, што яны не аплачваюць рахунак, прад'яўлены нам партыяй у сваёй пастанове ад 23 красавіка.

Партыя патрабуе спрацаванасьці кадраў і палепшаньне кіраўніцтва імі камфракцыяй аргкамітэту, патрабуе максымальнай выхаваўчай работы над усімі атрадамі мастацкага роду зброі. А ў нас знаходзяцца людзі, якія затрудняюць шлях да сацбудаўніцтва гэтым кадрам. Ці-ж не да гэтага роду належыць выступленьне тав. Кучара на паседжаньні Аргакамітэту ССП БССР, калі ён агульна зьмяшаў з гразёю стары кадр працуючых у БССР літаратуразнаўцаў? Такое выступленьне, такі падыход зьяўляецца шкодным, антыпартыйным, партыя не дапусьціць такімі выхадкамі скажаць так яе дырэктывы.

Партыя ўсё больш і больш надае ўвагі і сілы фронту мастацтва, як вучастку клясавай барацьбы. Партыя своечасова ліквідавала РАПП і ВОАПП, якія пачыналі станавіцца тормазамі разгортваньня нашае літаратуры. Урачыстасьць 40-гадовага Горкага паказала як наша краіна, пад кіраўніцтвам партыі, умее цаніць сваіх мастацкіх майстроў. Юбілей Янкі Купалы ў БССР быў доказам таго, як наша пралетарская грамадзкасьць высока ставіць рэвалюцыйныя заслугі нашага народнага паэты.

ЦК КП(б)Б і органы савецкай улады надзвычайна шмат увагі аддаюць літаратуры і мастацтву. Шэраг партыйных арганізацый (Менскі гарком КП(б)Б і інш.) праяўляюць жывы інтарэс да пытаньняў літаратуры і мастацтва, і патрэбна сказаць, што дужа часта мы ня выкарысоўваем тыя вялізарныя магчымасьці, якія нам дадзены. Са шляху нашай барацьбы патрэбна ўбраць усе перашкоды, патрэбна бязьлітасна біць правы апартунізм—асноўную небясьпеку на даным этапе, няспынна біць па «левакох» і вультарызатарах, патрэбна жорстка біць вялікадзяржаўніцтва і мясцовы шовінізм, наносячы таксама жорсткія ўдары па тым апартунізьме, які ў галіне мастацтва хаваецца падчас за бязьдзейнасьцю, ныцьцём які атрымлівае сваё выяўленьне ў падтрыманьні «добрых традыцый» РАПП, які пад левай фразай барацьбы з клясавым ворагам «б'е» дубінкай па пісьменьніках, ажыцьцяўляе адміністрацыйныя мэтады, па-барску адносіцца да савецкіх работнікаў мастацтва. З гэтым патрэбна весьці ўпартую барацьбу.

Мы стаім напярэдадні зьезду пісьменьнікаў БССР. Мы павінны падрыхтоўку да зьезду выкарыстаць для ўзьняцьця ўсёй работы пісьменьніцкіх кадраў і ў асаблівасьці—для разгортваньня абмеркаваньня творчых пытаньняў.

Гэта патрабуе ад нас узмацненьня барацьбы за якасьць нашай крытыкі, супраць вульгарызатарства і ўпрашчэнства, супраць апартуністычных разгавораў, што зараз у якой-небудзь ступені можа паслабляцца барацьба за бальшавіцкую партыйнасьць у літаратуры і мастацтва.

Падрыхтоўку да зьезду трэба весьці такім чынам, каб праз яе ўзьняць на вышэйшую ступень усю нашу работу і асабліва сувязь з рэвалюцыйнай практыкай рабочай клясы і партыі і ўзмацніць работу з рабочымі-ўдарнікамі, заклíканымі ў літаратуру.

На барацьбу за ўмацаваньне і рост нашых кадраў савецкіх пісьменьнікаў і мастакоў.

Пазбавіліся старых «рапаўскіх дыцый».

За поўнае ажыцьцяўленьне гістарычнай пастановы ЦК УсеКП(б)!

За энэргічную работу Аргкамітэту ССП, пад кутом бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі!

Лісты беларускай камсамолкі з польскага астрогу

Прыяцельцы В.

18 жніўня 1930 года,

...Перад усім мушу сказаць табе, што я, што ўсе мы, захоплены Асінбудам. Работніцкі пасёлак таксама выклікаў ня меншую цікавасьць, як галоўны корпус. Колькі мы прыглядаліся да гэтых прыхожых трохпавярховых дамоў з бальконамі і вялічэзнымі вокнамі.

О, вокны перад усім нам кінуліся ў вочы!

Нам здалося, што толькі ў нас там будуюцца дамы з такімі вялікімі вокнамі і, каб пераканацца, параўнялі работніцкі пасёлак з дамамі на адной з галоўных вуліц Кракава. І што-ж ты думаеш? Работнікі Савецкай Беларусі жывуць у дамох, дзе такія самыя вокны, як... у будынку... дзяржаўнага банку ў заходня-эўрапейскім горадзе! Вось табе што!

Ці-ж ня варта было сказаць, зрабіўшы такое адкрыцьцё? Як-жа добра, як цудоўна! «Абнімае душу без граніц, без канца маці-радасьць»—пісаў Янка Купала,—калі новы дзень яшчэ толькі нараджаўся. Што-ж гаварыць, пісаць цяпер?!

Ня менш мы захапляліся, але яшчэ больш дзівіліся апавяданьню твайму пра маленькіх піянэраў. Мы гордыя імі, мы шчасьлівыя, што пяцігодку выконваюць і яны. Шлём ім сваё палкае прывітаньне. Вельмі хацелася-б расказаць вам пра іншых «піянэраў», але...

Ці ўжо жнуць у вас? Які ўраджай. Як ідзе праца, мы ўжо тутака казалі, што жніва пэўна злучыць у калгасы новыя тысячы сялян...

Скончыўся ўжо XVI зьезд. Яшчэ мацнейшыя, яшчэ больш пэўныя пайшлі вы да новых перамог. Уся прэса тутэйшая, ды ці толькі тутэйшая, сачыла за ім з нязвычайным зацікаўленьнем. У выніку, разумеецца, поўны крах «трепетных ожиданий и надежд». Як-жа стараліся розныя паны і падпанкі аслабіць уражаньне, замаскаваць сваё расчараваньне. Вось прыемнасьць будзе чытаць! Але колькі разоў мы ўздыхалі...

Цяпер раскажу табе пра падзеі з нашага сьвету. Адправілі мы на волю трох нашых дзяўчат. Усе пайшлі неспадзявана. Ты ня ведаеш, што гэта за сьвята... Адпраўляюць на волю, асабліва з нашага вастрогу, куды прыяжджаюць на доўгія, доўгія гады. Нядаўна таксама і з нашае турмы вышла мая найлепшая найбольш каханая прыяцелька Н. Вышла таксама не спадзявана, бо далей, бачыш, трымаць яе ў турме было небясьпечна. Вось і далі ёй чатыры месяцы волі з наказам, каб яна за гэты час «адкарааскацца» ад усіх хвароб, што набавілася за сем гадоў турмы. «Вялікадушная, гуманітарная» штука, праўда?

Адным словам, як бачыш, радасьці ў мяне шмат і пішу я табе толькі пра радасныя падзеі. Так яно лепей... І лісты атрымаеш і... ну, адным словам лепей.

І я рада за цябе, В., што едзеш вучыцца і, адначасна, шкада мне, што ня будзеш ты на Беларусі, не раскажаш мне больш пра «родны край». Аднак-жа Беларусь гэта той куточак Саюзу, пра які найчасьцей думаецца пра які найбольш хочацца ведаць.

Прыяцельцы В.

17 жніўня 1931 г.

Дзяўчына мая каханая, добры дзень! Ад лісту твайго ў турме нашай запахла ельнікам і канюшынай, зашумела сьпелым жытам, засінела валошкамі *). А над усім—павеяла новым подыхам магутнай радасьці, сьветлай радасьці перамогі. Як-жа добра, як-жа нязвычайна, нязьмерна добра. Ці-ж можна сумаваць тут у астрозе, калі на Беларусі... Ой, В., як-жа сказаць сабе ўсё гэтае «калі»?

І з заплюшчанымі з шырока расчыненымі вачыма бачу душой, бачу новую Беларусь, чую гукі яе ніколі нябывалага жыцьця, і ці-ж магу яе не разумець, калі яна—ажыцьцяўленьне нашых лятуценьняў? Але што там лятуценьні? Творчая воля мільёнаў закасавана, далёка пакінула па за намі ўсякія лятуценьні. Яна стварыла шырозныя «усіхнія» палі, яна выслала на гэтыя палі калёны трактароў, яна на гнілых балотах пабудавала электрастанцыі, яна магутнай рукой спыніла бег жыцьця, які трываў стагодзьдзі і крута зьвярнула яго ў іншы бок, змушаючы яго да хуткасьці ў тысячы разоў большай.

Ведаеш, В., я магу ў захапленьні, але аднак, больш менш спакойна ўяўляць сабе новую Беларусь наогул. Але, калі я пераляту думкай у знаёмыя вёскі—убачу такое Граб'ё, ці Пагарэлае, ці Рагалі—і вось у Граб'і, у Пагарэлым, у Рагалях убачу трактар і камбайн, кіно, сямігодку і кааператыўную маслабойню, калі ўбачу знаёмых людзей у новых ролях, кіраўнікамі вось такога-гэтакага жыцьця—тады я... ня ведаю, не магу табе нават перадаць, што я тады чую, мне хочацца тады бегчы, ляцець, крычаць, ці сьмяяцца, ці... сядзець зусім ціхенька бяз руху, у нямым бязьмежным шчасьці.

Мая любая! Ты ўсё гэта рабіла, перарабіла сама, ты бачыла, як яно шалёнымі скокамі імкнулася ўперад, покуль дайшло да сёньня. А я-ж нічога не рабіла, я нічога ня бачыла, я толькі думала, рвалася і хацела, хацела... Думала з радасьцю, з болем, сашчаміўшы зубы, рвалася кожнай струнай душы ня толькі да вас, на вольную Беларусь. Я бачыла, ячаю і кахаю яшчэ і іншую Беларусь. Але ўсё дарма. Не мае хаценьне кіруе бегам часу. Іншая магутная і грозная сіла дае загады, якія датычацца і да мяне.

Усім родным

21 сьнежня 1931 г.

.. Вось і яшчэ адзін год прайшоў. У вас там за гэты год вырасьлі новыя магутныя фабрыкі, новыя калгасы, новыя школы і ўнівэрсытэты. Самі вы сярод мільёнаў іншых людзей, разам з мільёнамі расьлі, мацнелі, тварылі, чулі, як разам з радасьцю тварэньня ўліваюцца ў грудзі ўсё новыя і новыя сілы, новая вера і пэўнасьць. У мяне троха інакш прайшоў гэты год. Не кажу зусім інакш, бо такая ўжо дыялектыка нашага жыцьця, нашага часу. Зусім іншыя, супярэчныя абставіны родзяць тыя самыя настроі і розныя падзеі прыводзяць да таго самага пераконаньня. Так што і я, у выніку гэтага году, чую сябе і мацнейшай, і пэўнейшай, як раней, і перада мною таксама ўсё бліжэй і бліжэй разгортваюцца сьветазарныя шырачэзныя пэрспэктывы... А калі тымчасам што якое і ня зусім добра, дык што-ж там такое? (як кажа прыказка).

Вось пытаецца Д. ці досыць у мяне кніжак? Ха-ха-ха-ха! Ну, і сьмяяліся мы, як чыталі. Даражэнькая мая. На вуха табе скажу, што ўжо зараз забудуся, як кніжка выглядае. Як убачу калі-небудзь, дык буду пытацца: «што гэта такое?» Трымаючы ў руках кніжку, ведаеце, што гэта вялікае шчасьце, што ёсьць людзі, якія пра гэта толькі могуць лятуцець... Цікавіць мяне вельмі такое пытаньне: ці чуеце вы, якія вы шчасьлівыя? Ведаеце, што я вам скажу: калі якія-небудзь дробязі жыцьця займаюць у вас такое мейсца, што праз іх вы ня бачыце, ня чуеце, то вы—такія шчасьлівыя, што іншыя людзі, мільёны людзей ня могуць сабе нават уявіць,—дык... я ня ведаю... Але думаю, што вы бачыце сонца. Ці-ж можна яго ня бачыць?

Прыяцельцы Б.

27 сьнежня 1931 г.

Чаму-ж ты, родненькая, так доўга маўчыш? Не дачакаюся ад цябе весткі. Пераглядаю вось твае апошнія паштоўкі з Крыму, дзе мора адважна кідаецца, раве, і ясная радасьць і глыбокая ўдзячнасьць перапаўняюць душу: і там, і тады ты ўспомніла пра мяне ў панурыя вастрожныя муры пераслала гукі магутнай песьні вольнага шырокага мора... Але як даўно гэта было. Роўна тры месяцы таму назад— у верасьні. Уяўляю сабе, колькі працы за гэты час зрабіла ты, з якім вялікім напружаньнем працавалі вы ўсе, даводзячы да канца свой трэці і рашучы год. Я чую тэмп вашага жыцьця, я сонечна цешуся кожнай вашай перамозе. Я (ды ці-ж толькі я?) ведаю, што зрошчце вы больш і лепш за тое, што мы сабе толькі можам уявіць, але я не магу супакоіцца на гэтай пэўнасьці і гарыць вось і б'ецца думка: яшчэ хутчэй. Яшчэ мацней! Яшчэ глыбей і вышэй! І я магла-б памагчы, хоць здалёк, хоць пасярэдняя... Але—муры і чаканьне. Турма.

Ох, родненькая, дарагая! Нічога! Нічога, братка! Усё прыдзе, усё будзе, усё ажыцьцявіцца. Яваю жывой і сапраўднай стане ўсё палка-жаданае, з яраснай нецярплівасьцю чаканае.

В., любая, добра і ў турме. Бо сонца заглядае ў закратаванае ваконца, бо і тут жывуць з намі нашыя шырокія, буйныя думкі, і сьпелыя лятуценьні, і радасьць, і пэўнасьць, і нецярплівыя жаданьні.

І ў нас час ня мінае без падзеяў. Сваіх асаблівых вастрожных падзеяў. Сям'я наша ўсё пабольшваецца, расьце. Прыяжджаюць усё новыя таварышкі. Розныя, розныя. Міхая, паважная і ласкавая, сівая ўжо Д. і маладзенькая, вясёлая скакуха Г. і сярод шмат якіх іншых—маленькая дзесяцімесячная В., якая ў жыцьці сваім яшчэ ня бачыла волі, але якая глядзіць на сьвет такімі вялікімі, вясёлымі шэрымі вачыма.

А якія радасныя сустрэчы ў нас тут бываюць! Часам прыдзе сястра якой-небудзь таварышкі, якую яна пакінула яшчэ маленькай дзяўчынкай і нічога гадамі пра яе ня ведала. І вось сустракаюцца на вастрожным двары на спацыру... Уяві сабе гэта В.

А цяпер вось і ў мяне радасьць: прыехала мая колішняя «гадаванка»—мілая, каханая дзяўчына, якой я ня бачыла роўна пяць год. Як вырасла яна за гэты час, колькі бачыла, колькі перажыла. Прывезла мне шмат паклонаў, цікавых навін, розных вестак.

А сёньня ў нас—ужо зусім іншая радасьць: адна таварышка адсядзела свой прысуд і выходзіць на волю. Ці разумееш ты гэта, В.? Вось толькі што бачыла я яе. Увесь твар зусім іншы, новы. У вачох гарыць шчасьце глыбокае, нязьмернае: воля! Але які тужлівы боль зьвініць у голасе, калі яна нам кажа апошняе: «ну, бывайце таварышкі!..». І ўсё мы сёньня бліжэй, як заўсёды чуем волю і мацней, як заўсёды хочам на волю. Так страшэнна хочацца ведаць, што чутно ў вас, што нясе вам з сабой вецер з усходу, віхры з захаду. Пішы, мілая, хутчэй, так чакаю, так прашу цябе.

... Я ўжо ведаю, што гэта значыць вучыцца па ўдарнаму. Дзівіцеся, мы больш-менш гэта сабе ўяўляем. Але вось цяпер цікавіць мяне іншая справа. Усе вы папрыяжджалі вучыцца з розных рэспублікаў Саюзу, і, атрымаўшы кваліфікацыю, пэўна, у свае рэспублікі вернецеся: ты—на Беларусь. С.—да Узбэкістану і г. д., бо там вы найбольш патрэбны, найбольшую карысьцю будзеце, можаце працаваць. Дык вось: як-жа вы вучыцеся?—Ох, колькі, колькі хочацца распытвацца пра ўсё? Але трэба канчаць.

Прыяцельцы В.

12 чэрвеня 1932 году.

Дзе-ж ты запінула, мая дзяўчына? Пішу да цябе ўжо трэці ліст. Праз каго толькі можна перасылаю табе прывітаньні, шукаю цябе, клічу, а цябе няма, не адгукваешся. Вось ўжо зараз год, як была ад цябе вестка. Расказаць проста табе ня ўмею, як не хапае мне тваіх лістоў, тваіх вестак, таго паху Беларусі, які прыносіла ты мне.

В., мілая, слаўная, хачу «пажаліцца» табе, расказаць пра сваю тугу. Тужу я па волі, па працы, па Савецкім Саюзе на Беларусі і яшчэ шмат па чым... Успомнілася мне, што некалі ў нейкай часопісі чытала я такое: савецкі мастак Родчанка, апісваючы свае ўражаньні з падарожжа ў Парыж, ні ўзжнародны спаказ, захапляючыся прыгожасьцю Эўрапейскіх гарадоў і здабычамі Заходняй культуры, раптам кажа: «але, калі-б мне хто там сказаў: «астанься тут назаўсёды. Ня вернешся больш у СССР», я-б сеў пасярод вуліцы, і заплакаў, зароў-бы на ўвесь горад: ма-ма-а-а я хачу да дому».

Страшэнна мне гэта спадабалася. І як-жа часта мне хочацца так крычаць. Прачытаеш маленькую заметку пра Савецкі Саюз, пачуеш абрывак беларускай песьні: «... Пад вярбою вада...», успомніш першую з боку назву: «Лоеў», даведаешся: пабудованы 4 новыя вялічэзныя домны... і затрапечыш ўся, загарышся і затужыш адначасна. Хочацца мне вельмі, каб ты В., зразумела мяне, бо сама ты пэўна адчуваеш па іншаму. Ох, якое-ж рознае наша—маё і тваё жыцьцё...

Дзе ты цяпер? Ці ў Маскве, ці мо' дзе на практыцы?

На Паваложжы? На Урале? На Каўказе? У Туркменістане? На Беларусі? Вольная ты мая птушка, ці чуеш ты, што гэта такое: «воля? Калі знойдзе цябе мой лісьцік, напішы зараз-жа, В. любая, так ласкава і настойліва прашу я цябе. Але пішучы помні пра тое, што я хачу атрымаць твой ліст. Калі бачышся з Г., скажы ёй, што з усяе душы дзякую за атрыманыя дзьве паштоўкі. Ах, як спадабаліся нам «Вузаўцы». А беларускі наш унівэрсытэт бачу, разбудоўваецца ўсё шырэй, на новую на вашу меру...

Вось і канец ужо, а я-б хацела яшчэ так доўга гутарыць з табою. Ці было яшчэ калі такое цікавае жыцьцё як цяпер вось? Дык добра. Жыві-ж, любая, у творчым радасным яго напружаньні, а я тым часам мушу пажыць яшчэ ў чаканьні. І яно патрэбнае, горкае і таксама радаснае чаканьне. Бывай, да хуткага ўжо пабачэньня!

*) Увага: у ліст было ўложана некалькі каласкоў і кветак.

Пра трох яўрэйскіх пісьменьнікаў БССР

І. Сярэбраны

На шляхох да сацыялістычнай эпопэі

(Ізі Харык—„Круглыя тыдні“, ДзВБ. Яўсэктар, 1932 г.)

І днямі так, начамі так, за круглым тыднем тыдзень...
У гарапашных у людзей прапала гора—злыдзень.
(«Менскія балоты»).
Дні круглыя бадзёрыя, як брыгадзіраў вечар,
Уначы будуй, у дзень будуй—жар сонечны конвэер...
(«Круглыя тыдні»).

Паэма Ізі Харыка «Круглыя тыдні» бязумоўна займе самае высокае і пачэснае месца ў яго сёнешняй творчай эвалюцыі.

Паэзія Харыка нам ужо даўно знаёма з яе сацыяльнай насычанасьцю і драматызмам, з яе сакавітым вершам. «простым» рытмам і мэтрам, з яе гарапашным беларускім калерытам і па пеўнасьцю, з яе палітычнай палкасьцю і неспакоем, сюжэтнасьцю і актуальнасьцю. Вось усе гэтыя моманты атрымалі ў апошняй паэме свой кандэнсаваны і самы выпуклы выраз. Харык тут выступае як адзін з самых выдатных у савецкай паэзіі паэтаў-мастроў.

Паэма «Круглыя тыдні» гэта—мастацкі дакумант рэканструкцыйнага пэрыяду. Самым значным на даным этапе гэта цяжкая індустрыя, ды элекрафікацыя. Вакол гэтых галін разгортваюцца гарачыя сацспаборніцтвы і мэтады працы. Дык гэтыя галіны займаюць у творы цэнтральнае месца. Харык тут бярэ пэўнае акружэньне сацыялістычнага будаўніцтва ў Беларусі (Сталінстан), у цеснай сувязі з агульным уздымам і напружанасьцю, з разгорнутым наступам па ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва, з абвостраным клясавым змаганьнем, дасягненьнямі і пэўнымі перамогамі.

У вочы кідаецца шырокі эпапэйны абхоп пры вырашэньні цэлага шэрагу зьявішч і падзей. Гэта можна бачыць як паводле паасобных цэлых разьдзелаў, так паводле уступных вершаў да некаторых разьдзелаў.

Па ўсёй паэме расьсеяны пышныя малюнкі пралетарскага інтэрнацыяналізму, ударніцкага энтузіязму, радасьці і сьвята. Побач з гэтым, надзвычай удалыя мастацкія вобразы і крытыка старога эканамічнага і сацыяльнага ладу жыцьця, антырэлігійныя сцэны, разгорнуты гаспадарчы, лёкальны, тапаграфічны пэйзаж, сацыяльная самота і сваволя пры царызьме, кулацкая агітацыя, контррэвалюцыйныя змовы і шкодніцтвы, малюнкі беспрацоўя (у нас і ў іх), цяжкасьць уздыму і росту.

Усё гэта дасягаецца дзякуючы ў аснове заўседы ўдаламу пралетарскаму трактаваньню праблемы і матэрыі; дзякуючы арганічнасьці матар'ялу, якім ён апэруе, дзякуючы дасканалай інструмэнтоўцы вершу, рытму і лексыкону.

У гэтым сэнсе паэма Харыка мае шмат падабенства да «Трагедыйнай ночы» Безыменскага, нават паводле недахопаў і слабых мейсц (напрыклад абвінавачваньне ў тым, чаму Безыменскі прапусьціў капіталізм пры маляваньні Днепрабуду можа з тымі-ж правамі быць накіравана ў адносінах да Харыка. І ня толькі адно гэта). Рэглямант газэтнага артыкулу не дазваляе нам спыніцца больш падрабязна на гэтай вартай увагі і навучальнай справе. Досыць паказаць на розныя стылізацыі, пародыі ды апліканцыі, якія тут ужывае Бязыменскі: з «Полтавы», Пушкіна, «Песня про купца Калашникова» Лермантава і г. д. і параўнаць гэта з харкаўскімі своеасаблівымі пародыямі, стылізацыямі, перафразіроўкамі, ды рэмінісцэнцыямі з Аша, з архаічнага і рэлігійнага лексыкону, з розных яўрэйскіх і беларускіх песень, з яго уласных твораў і г. д.

Вельмі цікавае зьявішча, якое паказвае творчую і прынцыповую блізкасьць пралетарскай паэзіі ды паэтаў.

У паэме Харыка сустракаем, можна сказаць, узоры прынцыпова-праўдзівага высьвятленьня і мастацкай рэалізацыі праблемы зьявішч. Сапраўды: малюючы такія поўнакроўныя вобразы глухога палескага краю, Харык ня ўпаў і нават не пакаўзнуўся да ідэалізацыі і рамантызацыі фізыялегічнага і біялегічнага патрыярхальнага ды ідылічнага. Наадварот, усюды прыкметна асуджэньне і нэгатыўна аўтарскія адносіны да бруду, дзікасьці і сацыяльнага сваволья «бруднага» і «хліпкага» забытага краю. Вось гэтая устаноўка прасякае кожны радок вершу, кожную вонкавую і нутраную рысу з самага «хліпкага» рытму і

«Хлюпа-хліпка, хлюпка-хліпка. Хлам, хлам, хрып, хліп»...

«Плачучыя плюхаюцца,
Плюхаюцца воды
Воды сыплесьнявелыя
Сыплесьнявелых берагоў ды ракі
Арэсы (стар. 27).

Альбо такі абразок жудаснай самоты:

Такі скалелы край, такі прытоены
Як ты нагой па ім—ён ходырам.
Дзядуня скручаны пры тухлым вогнішчы,—
Раматус вохкае пад кажушком
(стар. 29).

Ужо няма што сказаць пра шырока намаляваную постаць Хэскеля Гомбінэра, пана графа, якія асуджаюцца ды апляўваюцца вострай іроніяй і сарказмам.

Той-жа самы край набывае зусім іншае значэньне, калі ён выкарыстоўваецца і далучаецца да нашага пралетарскага асяродзішча:

Торф—гэта хлеб, вазьмі еж ды сыцей.
Торф—гэта сіла цягліц і касьцей.
Торф—гэта кроў у кантакце машын.
Торф—гэта радасьць-гульня юнакоў.
Торф—ад бацькоў пецярнёй у шчаку
(стар. 42).

Асабліва гэта відаць ва ўрачысты час адчыненьня Сталінстану і ўрадавай пераклічцы гарадоў і мястэчак (стар. 118-119).

У сувязі з гэтым Харык правільна вырашае праблему тэхнікі. Не электрафікацыя наогул. Ён дыфэрэнцуе і супроцьстаўляе нашу электраэнэргію капіталістычнай:

Адна магістраль электрычных агнёў
Па ўсёй па савецкай плянэце.
І за акіянам саромна маўчаць
Крэслы для Сакко й Ванцэці
(стар. 122).

Экскурс у «тысяча дзевяцьсот дваццаць другі» (час, калі у нас было вялікае беспрацоўе) ды розныя іншыя экскурсы, вельмі характэрны для творчых прыёмаў Харыка. Харык вельмі любіць «граць» кантрастам, напамінаць і параўноўваць, «дражніцца» і «хваліць», праклінаць і блаславляць. Усюды Харык стварае сабе шматплянавую пэрспэктыву, ставіць супраць аднаго этапу разьвіцьця другі, новае—старому, сацыялістычнае і аптымістычнае—дэградаванаму і гніламу. Уся кампазыцыя паэмы збудавана паводле гэтага мэтаду.

Харык удала вырашае праблемы матар'ялу і матэрыі, праблемы нацыянальнай формы і сацыялістычнага зьместу. Паміж рабочымі, якія будуюць сацыялістычны Сталінстан, альбо іншыя прадпрыемствы і захоплены адным пралетарскім зьместам, усё-ж лёгка пазнаць іхнае беларускае, яўрэйскае, ды іншае нацыянальнае паходжаньне. Паводле іх гутарак, рухаў, танцаў і г. д., паводле вонкавай аўтарскай зарысоўкі і маляваньня. Таксама важна адзначыць той момант, што, малюючы вобразы рэканструкцыйнага пэрыяду, аўтар нідзе не адмаўляецца ад свайго ранейшага, «не індустрыяльнага» пэрсонажу і матэрыі, які яму блізкі і знаёмы. У гэтай паэме мы зноў сустракаем Піню з «Менскіх балот» (праўда, шмат перайначанага), мястэчка, бацьку шаўца, настаўніцу з паэмы «Душой і целам» і нават калі хочаце, сама назва «Круглыя тыдні», якая мае тут значэньне сацыялістычнай бесьперапынкі мае «крэўнасьць» з саматужніцкімі круглымі тыднямі ў «Менскіх балотах» (гл. мотто да нашага артыкулу). Такія асацыяцыі ды напамінкі вельмі характэрны для Харыка.

Такім чынам Харык нам славута паказаў, што ня толькі матар'ял і матэрыя самае важнае, а галоўнае, як апошняе падаецца і асьвятляецца.

Паводле тых некаторых трактаваньняў і падыходаў, якія мы прыводзілі, здаецца легка пазнаць чые інтарэсы і настроі выражае Харык. У аснове пралетарскую і сацыялістычную устаноўку Ізі Харыка легка пазнаць паводле дамінуючага настрою, які афарбоўвае і аб'ядноўвае усю тэму: з аднаго боку—палкая іронія, ненавісьць, сарказм і гнеў у адносінах да клясавага ворага ў ва ўсіх яго адценьнях і выяўленьнях, а з другога боку—радасьць і сьвята, інтымнае і палкае замілаваньне да нашага будаўніцтва, да нашых смуткаў і радасьцяй і наогул да нашай бацькаўшчыны СССР.

Але гэта ні ў якім разе не азначае, што ў паэме няма прынцыповых і творчых недахопаў. Такія шурпатасьці ёсьць. А некаторыя з іх нават досыць значныя. Мы ўжо вышэй зьвярнулі ўвагу на адзін сур'езны «супольны» недахоп у Харыка і Бязыменскага. Тут мы дададзім вось што:

Не паўсюды ўдалося Харыку апранаць у мастацкую кроў і мяса намаляваныя ім аб'екты. Піня, прысланы з гораду партыец, нам куды больш знаёмы паводле яго выгляду з «Менскіх балот». У паэме «Круглыя тыдні» ён галоўным чынам паказаны, як гэта кажуць, «функцыянальна», апрача некаторых характэрных адзнак, якія аднак нагадваюць зноў-такі больш «старога знаёмага» «Піньку-вярзілу».

Вось напрыклад, «выказваньне» Піні:

Прашу, у канцы дазвольце мне сказаць.
Пацалаваць пад хвост глыбока можам,
Калі адразу не рэагаваць,
Дык прапаную вось: абраць брыгаду,
Праветрыць гарлякі свае: г-га-кыш»
і г. д. (стар. 66).

У параўнаньні з шэрагам іншых нэгатыўных постацяй,—бледна паказаны Мікола—камсамолец і галоўнае сакратар парткому, татарын Голіеў. Куды больш натуральным і арханічным адмаляваны кулак Карнейчык. Зноў-жа сэзоньнікі паказаны праз меру агульна і схэматычна: апошняя зьяўляецца ўвасабленьнем адсталасьці, ды ўсяго аднолькага без якой-бы там прыкметнай дыфэрэнцыяцыі. Гэта ні ў якім разе не адпавядае сапраўднасьці. Сэзоньнікі складаюцца са значнай масы былых батракоў калгасьнікаў і сераднякоў і ўсіх гэтых нельга браць як нейкіх «прапалых» людзей.

Таксама незакончана характэрыстыка шырокага намаляванага вобразу Хэзкеля Гомбінэра, ня гледзячы на тое, што аўтар у асноўным удала выкрыў сапраўдны клясавы твар ідэалізаванага і рамантызаванага яўрэйскага купца і багатыра. Аўтар правільна выкрыў нацыянальную своеасаблівасьць яўрэйскага купца, яго частковую залежнасьць ад пана, але пры гэтым вельмі мала паказаны моманты салідарызацыі і агульна-клясавыя інтарэсы, і якраз гэта галоўнае і асноўнае, што трэба было паказаць, калі хочуць быць кансэрвэтным да канца.

Гэта паводле нашага погляду самыя важныя шурпатасьці, якія можна заўважыць у апошнім творы Харыка. Але агульны тон і пануючы пануючы падыход і настрой у паэме такі, што нават паказаныя недахопы бадай не адчуваюцца. Рэвалюцыйная масавая радасьць і энтузіязм, нянавісьць і любоў, рэвалюцыйнае змаганьне і надзея суправаджаюць усе галоўнейшыя этапы разьвіцьця, якія праніззалі нашу краіну і яе паасобных герояў. Ад затхлых варштатаў, ад «круглых тыдняў» голаду і нэндзы, нявольі прыгнёту, праз рэвалюцыйнае змаганьне, грамадзянскую вайну, праз руіны і беспрацоўе, да разгорнутага магутнага сацыялістычнага наступу да «магістралі шчасьця», да электрычнага «цёплага пульсу» ад полюсу да полюсу, да пэрспэктывы камунізму.

Гэта ўжо творчыя шляхі да разгорнутай сацыялістычнай эпопэі, да шырокага мастацкага палатна нашай поўнай заклікў рэвалюцыйнай эпохі.

В. ВІТКІН

Кніга З. Аксельрода „Вершы“

З. Аксэльрод зьяўляецца адным з самых таленавітых савецкіх лірыкаў. Яго апошнія вершы аб Чырвонай Арміі зьяўляюцца пачаткам новага творчага этапу ў яго паэзіі.

Таму так неабходна цяпер падагуліць пройдзены творчы шлях і намеціць асноўныя тэндэнцыі яго далейшага разьвіцьця.

У сваёй кнізе «Яўрэйская пасьлярэвалюцыйная літаратура» на Беларусі» т. Аршанскі вось як кваліфікуе сацыяльны эквівалент Аксэльрода».

«Вось тут, у пакутах дробнай буржуазіі, якая асуджана адмовіцца ад сваіго мінулага, якая прымушана, як матар'яльна, так і духоўна перарадзіцца, але якая ня хоча гэтага (падкрэсьлена мной—В. В.), бо яна кансэрватыўная, бо яна ня хоча ад мовіцца ад крамніцтва ва ўсіх адносінах—вось тут для іх ён знаходзіць (З. Аксэльрод—В. В.) словы і фарбы у сваёй паэзіі».

Верна, што Аксэльрод у сваёй паэзіі выразіў дробную буржуазію, але няправільна будзе думаць, што Аксэльрод выразіў інтарэсы той часткі дробнай буржуазіі, якая ня хоча свайго перараджэньня.

Не, Аксэльрод выразіў інтарэсы дробнай буржуазіі, якая хоча стаць саюзьнікам рабочай клясы, але якая так глыбока яшчэ грузьне ў дробна-буржуазным асяродзішчы, што пакуль-што няможа яшчэ перарадзіцца.

У вершы Аксэльрода «Стары дом» маюцца наступныя радкі:

Ціха тут бруць халодны смутак,
Яшчэ гавораць, як даўней, спакойна...
Хто мяне прасіў, каб я сюды прыблукаў?
Чаму я сам быў гэтай прагай поўны?...
Тут вулкі ўсе вузенькія, крывыя,
Можа мае вока кінуцца сюды.
Усё-ж не магу глядзець сьвятлей я
За тых усіх, што з гэтае зямлі...
У Маскве лепей, у Маскве мне так цудоўна,
што пяецца ля ракі сьвятла...
Дом стары—як нож тупы усё роўна:
Ня можа быць вастрэй, ня можа зачапляць.

Пра што тут гаворыцца?

Тут гаворыцца пра тое, што стары дом ціхі, халодны, смутны «тупы нож», які «ня можа быць вастрэй», «ня можа зачапляць!, што «ў Маскве ляпей! чым ў старым доме, «што ў Маскве лепш пяецца», але ня гледзячы на усё гэта, усе-ж цягне паэта да старога дому. Тут мы маем яскравы выраз таго, наколькі цяжка паэту ідэолёгічна ператварацца.

Настрой, які пануе ў вершах Аксэльрода—гэта ня смутак, які паходзіць ад нежаданьня адмовіцца ад сваёй дробна-буржуазнасьці, ад неабходнасьці адмовіцца ад яе, як думае т. Аршанскі. Пануючы настрой яго—«цяжка зьмяніць сябе».

Вось гэтыя цяжкасьці перайначыць сябе часта прыводзіла паэта да пэсымістычных настрояў, да смутку, да маркоты. Часта бывае, што паэт нават захапляецца гэтымі настроямі. Так, напрыклад, ён кажа ў сваім вершы, прысьвечаным Ізі Харыку:

Калі туга з тваіх радкоў прарвецца,
Тады люблю вершы я твае...

што замяніць сябе цяжка, што кляса, сацыяльны строй не перараджаецца ў адну ноч—гэта зразумелая рэч і ў гэтым шчырасьць Аксэльрода—«цяжка зьмяніць сябе». Такая шчырасьць дае надзею, што ён моцна і грунтоўна адродзіцца. Але да т. Аксэльрода мы мелі права прад'явіць такое абвінавачваньне: занадта паволі ў яго адбываецца працэс перараджэньня.

Ясна, што аднэй з прычын яго марнага перараджэньня зьяўляецца тое, што паэта глыбока сядзеў ў дробна-буржуазным асяродзішчы. Пахутчыць перараджэньне дробнага буржуа ў бок пралетарыяту магчыма толькі пры умове разрыву з дробна-буржуазным асяродзьдзем, адштурхоўваючыся ад яго і ўзрастаючы ў савецкі пралетарскі асяродак.

Нельга ўяўляць сабе, што творчасьць Аксэльрода першга пэрыяду зьяўляецца аднастойнай, мае адзін настрой, без усялякіх нюансаў. Так думаць будзе няправільна. Творчасьць Аксэльрода мела хістаньні, паэт гэта сам адчувае. У адным вершы ён так характэрызуе сваю паэзію:

Радкі мае і хісткія і ціхія...

І мы заўважаем, што Аксэльрод увесь час хістаўся ў ўспрыйманьні савецкай рэчаіснасьці, то аддаляецца ад правільнага ўспрыйманьня яе, то набліжаецца. Але цікава адзначыць, пры якіх абставінах адбываюцца гэтыя набліжэньні і аддаленьні. Аксэльрод аддаляецца ад успрыйманьня савецкай рэчаіснасьці тады, калі ён датыкаецца з дробна-буржуазным асяродзішчам. Як толькі ён прыходзіць у дробна-буржуазнае асяродзішча, яму кожная дробязь нагадвае шмат чаго, паэтам авалодваюць дробна-буржуазныя настроі.

Наадварот, калі паэт датыкаецца з пралетарскай, савецкай грамадзкасьцю, тады ён набліжаецца да савецкага ўспрыйманьня рэчаіснасьці. Так, напрыклад, у вершы, пра беспрацоўную моладзь, якая кладзе шпалы, Аксэльрод піша:

Яшчэ ня ўсё для іх тут прапала
Ня можна,
Ня трэба
Кідацца праз мост.
Яны будуць стала класьці шпалы.
Са ўсімі разам ўстануць на ўвесь рост.

Праўда, паэт яшчэ не зьяўляецца тут актыўным удзельнікам сацыялістычнага будаўніцтва, ён толькі назіральнік, ён толькі з боку аглядае, але ён бачыць, што чалавечая сіла ў сацыялістычным будаўніцтве—найвялікшае шчасьце, сэнс жыцьця.

У гэтым вершы ёсьць нават і пэсымістычная афарбоўка:

Яшчэ ня ўсё для іх тут прапала...

Гэта вынікае з пасыўнасьці паэта. Але ўжо тое, што паэт бачыць сэнс жыцьця, найвялікшае шчасьце ў удзеле ў сацыялістычным будаўніцтве,—зьяўляецца крокам наперад.

Калі паэтам авалодваюць уражаньні з дробна-буржуазнага асяродзішча, тады ён кахае сябе, самоту, ціш. Калі-ж ён датыкаецца да савецкай грамадзкасьці, якая ўплывае на яго, тады ў яго паяўляецца калектыўнае пачуцьцё:

Іду дахаты (пасьля працы В. В.)
Позьні вечар.
Масква сівее ў ліхтарох.
На стрэчу—столькі твараў чалавечых!
Каб кожнага я да сябе паклікаць мог.

Паэту прыходзіцца ўвесь час змагацца з самім сабой, з яго дробна-буржуазнасьцю. Тут яму цяжка.

Аксэльрод адчувае, што цяжкасьць яго сацыяльнага перараджэньня прыводзіць яго да блуканьняў, ён адчувае сябе ў савецкай рэчаіснасьці як госьць ў кутку стала. Ён фіксуе, што не перарадзіўся яшчэ:

Усё-ж не магу глядзець сьвятлей я
За тых ўсіх, што з гэтае зямлі.

Ён ведае, што

Часта цяжка успрыняць мне—
Што здараецца і адбываецца.

І паэта прыходзіць да выніку:

Сярод дарог сябе я выкрыў
І кідаўся на тысячы бакоў.

Для паэта характэрна, як ён мысьліць пра месца, якое ён займае ў грамадзтве. Ён ня прысягае, што ён рэвалюцыянэр, як гэта робяць іншыя дробна-буржуазныя пісьменьнікі, думаючы, што перарадзіцца, значыць толькі фармальна прыняць Савецкую ўладу. Аксэльрод ня любіць займацца самаашуканствам, ён ведае, што

Выхожу на сярэдзіну дарогі.
Каб яснасьці напорнай дасягнуць.

Але паволі, марудна, але паэт пачынае дасягаць «яснасьці». Ён прыходзіць да выніку, што

Я так шмат пра сябе разважаў,
Што забыўся пра наша жыцьцё.

Ён пачынае пісаць ня толькі пра сябе. Ён піша верш, у якім выказвае спачуваньне таварышом, расстраляным польскімі фашыстамі. Праўда, паэт ня можа яшчэ усе гэта ўспрыняць у поўнай канкрэтнасьці. Ён успрымае гэта абстрактна. Але як-бы там ні было, паварот да савецкай тэматыкі быў крокам наперад у творчасьці Аксэльрода. Ён сам пачынае адчуваць у сваім узросьце:

Людзі кажуць—усім я верыць буду.
Ён прайшоў, майго дзяцінства дрож.
Маіх вачэй глыбокіх перапуды
Змыў крышталь, ясны дождж.
Больш упэўненым мой крок зрабіўся
І мацнеюць словы ясныя мае.

Варта адзначыць, што яго вершы пра каханьне поўныя радасьці, гэтыя вершы—сьвежыя, шчырыя. Вершы Аксэльрода глыбока лірычныя, вобразныя, эмацыянальныя, яны заражаюць чытача паэтавымі пачуцьцямі. У нашай карэткай нататцы мы ня спыніліся на такіх вершах, як «Спартакія» да «Маякоўскаму», «Шахматы» ды інш., якія зьяўляюцца бадзёрымі і моцным..

У Чырвонай арміі адчуў сябе як сапраўдны, як патрэбны грамадзянін. Тут ён уцягнуўся і адчуў непасрэдна сацыялістычнае будаўніцтва. Адарваны ад дробнабуржуазнага асяродзьдзя, акружаны здаровай чырвонаармейскай пралетарскай рэчаіснасьцю, паэт адчуў свой вялікі абавязак не маўчаць.

Няхай лепшей куля мне сэрца навылет праб'е.
Як далей маўчаць каля ўласнага парогу.

Ён асуджае сваё маўчаньне (перад сваім уходам у армію Аксэльрод пэўны час ня пісаў, гэта тлумачыцца тым, што паэт ня зусім здолеў аслабаніцца ад сваіх ранейшых настрояў; гэта і прывяло яго да пэўнага зацішша). Ня пустую дэклярацыю, а абвяшчэньне актывізацыі паэта мы ўжо наглядаем у яго далейшай творчасьці. І гэтая дэклярацыя ідзе разам з цыклем чырвонаармейскіх вершаў, якія зьяўляюцца навіной у яўрэйскай савецкай літаратуры. Я ня хочу сказаць, што чырвонаармейскія вершы Аксэльрода зьяўляюцца ўжо такімі, якіх Чырвоная армія заслугоўвае. Не. Але трэба адзначыць, што чырвонаармейскія вершы характэрызуюцца радасьцю ад адчуваньня таго, што ты зьяўляешся карысным для савецкай грамадзкасьці, сур'ёзнасьцю і адказнасьцю перад задачамі, якія ставяцца перад ім, як перад чырвонаармейцам, яны вызначаюцца вобразнай насычанасьцю. У цэнтры ўвагі паэта ў гэтых вершах стаіць не ягонае «я», але калектыў, «мы». З гэтых вершаў крыніцыць фізычнае і духоўнае здароўе.

У вершы «Чырвонаармейскі суботнік» перадаецца праз цэлы шэраг вобразаў радасьць чырвонаармейскага калектыву, які зрабіў грамадзка-карысную працу для пралетарскай дзяржавы. Настолькі вялікая гэтая радасьць, што стомленасьць пасьля работы ўжо зусім ня стомленасьць, бо—

Праца наша не загіне дарма.
Стома ясная па целе пройдзе.

Вось гэтая радасьць, гэтая моц—асноўнае ў гэтым вершы. Вы адчуваеце і вы ўпэўнены, што работа, зробленая чырвонаармейскім калектывам, не загіне. У вершы «Пост № 4» вы адчуваеце тую вялікую адказнасьць, якую нясе чырвонаармеец, стоячы на варце.

Мы маем права і мы павінны патрабаваць больш ад такого таленавітага паэта, як Аксэльрод. Паэт мае ўсе магчымасьці задаволіць нашыя патрабаваньні. Цяпер мы адзначаем яго чырвонаармейскія вершы, як радасны паварот ў творчасьці Аксэльрода.

Далейшае творчае разьвіцьцё З. Аксэльрода [illegible] толькі праз яго непасрэдным удзелам у сацыялістычным будаўніцтве, адштурхоўваючыся ад дробнабуржуазнага асяродзьдзя. Гэта адзіны шлях для таго, каб канчаткова «моцнай яснасьці дасягнуць».

Ізі Харык

З паэмы „Душою і целам“

Мы—маладая гвардыя...

Вільготнае неба, празрыстасьць і просінь,
Вільготнае, сьветлае — ў восенскім смутку.
У павольнай дарозе скрыгочуць калёсы,—
Калі ўжо прыедзем? Калі ўжо? Ці хутка?
Цяжка і душна ў пяшчаным тумане,—
Вёрсты, і вёрсты, і вёрсты... Зьнямелась...
Яна ў калёсах прыляжа, прыўстане,
І туліць і туліць засьмяглае цела...
Чатыры гады... І канец. І прапылі...
І выпуск—растаньне быў сьветла балючым...
Яна 'шчэ ў мястэчку папробуе сілы,
Бурлівасьць юнацтва, гаручасьць — кіпучасьць!
Упэўненасьць, лёгкасьць,—памерацца можна,
Уліцца ў працу душою і целам...
Мястэчкі—мястэчачкі гнёздаў самотнасьць,
І праўда, што хутка скуе вас зьмяртвеласьць?
А можа ня ўсё там аплецена плесьней,
А выйдуць мястэчкі, як козы, на пашу?
Гэй, балагола, ці ведаеш песьню,
Якую пяюць 200.000 ў шчасьці? *)

*) Песьня з п'есы Шолам Алэйхэм—«200.000» ў пастаноўцы Маскоўскага Дзяржаўнага Тэатру.

Трэція заняткі

Спачывае ў небе пушна-белы вецер,
А мароз—як цукер на зубах
Вось яна ціхутка усьміхнецца,
Скамянецца..
Поўдзень у сьнягах.
Яна крочыць па пакоі лёгка,
Сее сонца вязкамі сьвятла.
Каб ня голас сдушана стамлёны,
Дяк сказала-б:
Мусі боль прашла...

Вучні. Пішуць. Трэція заняткі
Ў трэцяй групе. Ў клясе цішыня.
Сьнедны поўдзень—вуліцаю гладкай
Хгдзяць сілы
у крышталях дня.
Вучні. Пішуць. Шэпты, шэляст сшыткаў.
Сьнежны поўдзень, і нябёс ціша...
На смуглявым лобе няпрыкрытым
Мягка села
лёгкая раса.

Дзень добры, сьвет!

Дарога—сьнег, вясёлкі, сіпь,
Кавалкі сонца і бязбрэжжа.
Праменьнем дзень прасторы арасіў.
Бялявасьцю балюча вочы рэжа.
Мароз спавіў мядовым хмелем бель,
Спакой палёў дыямантамі ўквечан...
«Дзень добры, сьвет! Вітань, вітань табе!»
І добра ёй ў кажуху авечым.
Плыве нябёс празрыстасьць, мятульга,
Хлапцоўскі сьвіст, маўчаньне і задумнасьць.
Во' калектыў здалёку замільгаў,
Плыве, плыве з хацінкамі і тлумам.

З яўрэйскае мовы пераклаў
Ізраіль Плаўнік.

Х. Дунец

Пра творчасьць М. Кульбака

І

М. Кульбак прыбыў ў Савецкі Саюз нагружаны спадчынай ня нашай. Сваю інтэлектуальную культуру Кульбак чэрпаў галоўным чынам з яўрэйскай кабалістычнай філёзофіі, з яўрэйскай містыкі і схолястыкі, а з другога боку, з расійскага і яўрэйскага сымбалізму. Гэта культура буржуазная, гэта крыніца не пралетарскія. І вось з гэтага т. Кульбак вярнуўся да нас, калі адчуў, што атмосфэра замежнай буржуазнай і дробна буржуазнай літаратуры яго душыць.

Прышоўшы да нас, ён павінен быў прарабіць цэлую рэвалюцыю ў сваім творчым мэтадзе і шмат над сабою працаваць, каб вывучыць, успрыняць тую, эпоху, калі будуецца сацыялізм. Творчы мэтад т. Кульбака да таго, як ён прыбыў да нас быў мэтадам сымбалістычным, буржуазна-мэтафізычным, ня гледзячы на тое, што месцамі яго творчасьць была ўзвышана бунтарскім пратэстам («Горад»). «Бунтаркасьць» у яго творах таго часу не паходзіць з клясы, якая мае ясныя, пэўныя рэвалюцыйныя мэты і пэрспэктывы— з пралетарыяту—гэта бунтарскасьць была ў лепшым выпадку дробна-буржуазна-радыкальнай.

Калі возьмем твор Кульбака «Мошыях бэн Эфроім» («Мэсыяш сын Эфраіма»), у якім нібыта паказаны бунт супроць рэлігіі, дык гэта рэфлекс на кабалістычна-містычнае вызваленьне чалавека, нібыта бунт нібыта памфлет супроць рэлігіі, але практычна рэформаваная папоўшчына, «сьпеў збунтаванага цела», расхрыстаная філёзофія, водгалас містычна-анархічнага бясьсільнага пратэсту супроць фэўдальнага смутку. Было-б цікава выкрыць стымулы, якія прымушалі Кульбака пісаць такі твор,—хутчэй за ўсё мабыць гэта рэфармаваная мэсыяніская папоўшчына была вынікам таго, што Кульбак ў часы вайны і галоўнае ў пасьляваенны пэрыяд ўгледзеў змрочнае кананьне дробнай буржуазіі пры ўмовах буржуазнай ўлады. Уцякаючы ад капіталізму, які руйнуе і нішчыць дробную буржуазію, Кульбак спрабаваў ратавацца праз «Мэшыях бэн Эфроім».

Гэты рэакцыйны мэсыянізм пакінуў свой адбітак і на рамане «Панядзелак». Кніга «Панядзелак» гаворыць пра нашу рэвалюцыю, але там ўсё паказана ў такім асьвятленьні, што рэвалюцыя кампрамэтуецца. Замест праблемы эксплёатаваных клясаў, якія дабіваюцца свайго вызваленьня праз рэвалюцыю, Кульбак у сваім рамане «Панядзелак» ставіць праблему люмпэн-пралетараў, дэклясаваных анархічных элемэнтаў, якія бачаць сваё вызваленьне ў заключэньні міру з беднатою. Уся ідэя кнігі аддае талстоўшчынай, усю цяплыню аўтар тут аддае сацыяльнаму гною, падонкам грамадзтва, пры гэтым ён разгортвае аднабаковую філёзофію, жабрацтва, якая паказвае яго, Кульбака, жабрацтва ў філёзофіі... Уся кніга прасякнута Шапэнгаўэравым пэсымізмам, расслабленасьцю, надломленасьцю расчараванасьцю, страхам перад масавым рухам, дробнабуржуазнай вузкасьцю, пасыўнасьцю і бязумоўна зьяўляецца адлюстраваньнем неразуменьня характару рэвалюцыі ў эпоху імпэрыялістычных войнаў і сацыяльных рэвалюцый.

«Буня і Бэра»—пазьнейшая вялікая паэма Кульбака. Таксама і тут працягваецца філёзофія мэсыяніцкага вызваленьня ад ранейшых містычных твораў. Таксама і тут ў гіпэрбалічнай форме ўзьняты да героічнай бунтарскасьці актывізаваны люмпэн, які кпіць з клясавых ідэалаў пралетарыяту.

У паэме «Райсн» ня гледзячы на тое, што там няма мэсыяніцкага ідэалу вызваленьня, таксама ёсьць рысы буржуазнай рамантыкі і сымболікі. Рамантызацыя старога, ідэалізацыя статыкі, закансэрваваньне ўчарайшага дня, ідэалізацыя дужых дзядзькоў і пладавітых цётак, культ кулацкіх асілкаў,—толькі новая спроба працягваць надалей вырашаць ідэалістычна, на буржуазны лад, праблемы сацыяльнага вызваленьня. Гэта зноў-такі гімн усемагутнае фізыялёгіі, цалкам адарванае ад клясавых канфліктаў, якія створаць рэальныя рухавыя сілы ў грамадзянскім жыцьці.

Усё гэта зьяўлялася адлюстраваньнем у мастацкай форме тых буржуазна-клясавых уплываў і рэакцыйных тэорый якія стварылі кульбакавыя філёзофічныя, а разам з тым і творчыя крыніцы да яго прыбыцьця да нас у Савецкі Саюз.

Прыбыцьцё Кульбака ў Савецкі Саюз з ня толькі знак ў прасторы і часе. Не. Зварот Кульбака ў Савецкі Саюз ёсьць вынік пачатку пераацэнкі каштоўнасьцяй. Яго прыбыцьцё да нас адзначае расчараваньне ў буржуазнай культуры ды імкненьне да нечага іншага.

Кульбак «спазьніўся», такім чынам, да рэвалюцыі на дзесяць год. Ён спазьніўся, Кастрычнікавая рэвалюцыя яго спачатку аглушыла і зьбянтэжыла. Акопаны кансэрватызмам, ён не прымаў яе ў першае дзесяцігодзьдзе. На рэвалюцыю ён тады глядзеў вачыма сваіх дзядзькоў і цётак, сваіх Буняў і Бэраў; ён з падазронасьцю паглядаў на горад і на вызваленьне, якое прыносіць пралетарская рэвалюцыя. «Сьвет, затулены тысячамі твараў, іду да цябе па тысячы шляхоў, —куды? Ня знаю сам...» (верш «Сьвет»). Ад зьбянтажанасьці Кульбак ня ведае што рабіць: ісьці з рэвалюцыяй? Яна вабіць яго сваімі чырвонымі агнямі, але ён ёй ня верыць, бо яму здаецца, што «рукі» рэвалюцыі «просяць і мацаюць у пацёмках» (Верш «Расіі»). Рэвалюцыю робіць гарадзкі авангард, яна падыходзіць з фабрыкаў і рабочых вуліц, але Кульбака палохае імпэтны крок гарадзкой культуры, хаця часткова яго захапляюць цуды (страшныя цуды) гораду. «Зьвініць ў цяжкай плыні горад, гудзіць каменны голас пад ярмом сталёвым»—так выглядае горад. І пясьняр ратуецца ад «гарадзкога ярма». Яго істота ачышчаецца, калі ён бачыць «чысьцюткабелыя хрызантэмы» і «дзіцё вёскі з водарам поля», пасьля таго,, як ён цяжка адчуў камень і мэталь... людзей у чырвані і белі фабрычны дым...»

У паэме «горад», з якой цытую гэтыя радкі. Кульбак кажа, што «падвоены той гарады і вёскі, а я стомлены вандрую пасярод ад раньня да начы». Істота Кульбака раздвоена, пашчэплена: ён глядзіць рэвалюцыі ў самы твар, палохаецца яе адыходу і гарадзкой мэталёвай культуры, якую Кульбак падазрае, нібы яна, гэтая культура, наступае, каб зьнішчыць лес і вёску.

Пры такой дваістасьці ў адносінах да рэвалюцыі, Кульбак ня мог паказаць імкненьняў пролетарыяту. Масянжовыя юнакі «гораду» Кульбака доўга ўспрымаліся за пралетарскія сымбалі, але ў сапраўднасьці досыць іх уважліва прадумаць, каб заўважыць, што праз гэтых юнакоў чуваць няўпэўнены крык сацыяльнай расшчэпленасьці з моцным ухілам да адыходу ад рэвалюцыі. Таму юнакі затушаваны: «З начных адхланьняў ідуць, яны йдуць ў цёмныя кругі, у шэраг туманны, звузлаваўся народ са сьмерцьцю сьвятой». Зразумела, што гэта не рабочы народ, зразумела, што калі Кульбак кідае кліч да гэтых самых «масянжовых юнакоў»: «Гэй! Бярэцё і мяне, хай у цёмнай хадзе і мая істота ня маўчыць», — ён у другі раз паказвае, што ён не заўважыў ходу рэвалюцыі, а ў ёй бачыў толькі «цёмную хаду».

Гэтым вяжацца тое, што ён ў паэме «Буня і Бэра на шляху» паказаў анархічна-пэсымістычная і кплівыя адносіны да рэвалюцыі, расчараваньне ў вызваленьні, якое ідзе са сталёвага гораду, супроць якіх яго новафасонныя Дон-Кіхоты—Буня і Бэра—выступаюць з... імем Маркса на вуснах.

Значыць—да 1928 г. мы маем у Кульбака ня толькі чалавека, які быў паводле пашпарту на «тым баку» нашых межаў, але гэта быў на той дзень яго ідэалёгічным пашпартам. І Кульбак павінен быў выехаўшы ў Савецкі Саюз разьлічыцца са сваім уласным сумленьнем, прыняць іншае станаўленьне да рэвалюцыі, зразумець яе зьмест, стаць на пункт гледжаньня пануючае клясы ў рэвалюцыі—пралетарыяту, і зьняць з сябе містычную вопратку, рамантычны шлейф, скінуць з сябе кансэрватыўнага дробнага буржуа, які ў найлепшым выпадку можа толькі пратэставаць супроць «гарадзкіх комінаў»... Ці ўдалося гэта Кульбаку ды ў якой меры? Аб гэтым трэба судзіць паводле яго цяперашніх твораў, што трэба рабіць па кнізе «Зэлмэньянэр».

«Зэльмэньянэр» вялікі пераломны этап у творчасьці т. Кульбака. Гэта першы крок да ідэалёгічнага вызваленьня аднаго з таленавітых яўрэйскіх пісьменьнікаў, які быў нагружаны вялікай буржуазнай містычна-сымбалічнай спадчынай. Мы ведаем, што многа сымбалістаў з яўрэйскіх пісьменьнікаў пакуль што яшчэ не вызваляюцца з-пад старога ярма, як напр. Ністэр, Рэзьнік ды інш. Трэба адразу сказаць, што тав. Кульбаку яшчэ не ўдалося цалкам сябе перамагчы. Але ў кнізе «Зэльмэньянэр» Кульбак паказвае тэндэнцыю адмаўленьня ад старой буржуазнай культуры з яе ідэаламі, традыцыямі і бытам.

2.

Што ўяўляе сабою кніга «Зэльмэньянэр»? Тав. Кульбак бярэ саматужніцкі патрыярхальны дом на які ў пэрыяд сацыялістычнага будаўніцтва па веяла савецкай атмосфэрай, куды гэта атмосфэра да гэтага часу не праходзіла праз «кітайскія сьцены» консэрватыўнай кулацка-дробнабуржуазнай застыгласьці.

У гэтым творы Кульбак імкнецца зразумець бытавыя зрухі, якія выклікала кастрычнікавая рэвалюцыя ў яўрэйскіх саматужніцкіх пластах. Для Кульбака гэта яго ўласны, добразнаёмы сацыяльны пласт, які зьвязвае свае асноўныя ніткі з гаспадарча моцнай дробнабуржуазнай клясай.

З глыбіні Расіі прыехаў стары Зэлмэлэ сюды, у беларускі горад. Ад яго, ад Зэлмэлэ, пахне «заляжалым сенам», цяжкай незакілзанай фізычнай сілай, чорнай густой крывёю, прагнасьцю, цьвёрдасьцю і дзікасьцю. Зэлмэлэ Хвост мае свой дом, моцны капіталец, увесь былы гаспадарчы лад жыцьця, тэндэнцыю кулацкага абрастаньня. Дом Зэлмэньянэра дыфэрэнцуецца ў працэсе разьвіцьця на «тры магутныя плыні і некалькі пабочныя ручальнік». Тут мы маем справу з сацыяльнай дыфэрэнцыяцыяй. Вялікі дом, спачатку патрыяхальна-ідылічны, расшчэпліваецца, пасярод дзяцей і ўнукаў Зэлмэлэ зьяўляюцца мацнейшыя і слабейшыя, шляхетныя і простыя. Нады ходзіць Кастрычнікавая рэвалюцыя і выпуклае сацыяльныя кантрасты, надае сюды рэвалюцыйныя фактары, якія паглыбляюць процьму паміж раз розьненымі ў гэтым доме і зьнішчаюць патрыяхальнасьць аб'яднаную сям'ю Хвост—вось, такую, як яна жыла ў старыя зэлмэньянскія часы. З зэльмэньянскага дому людзі цягнуцца на франты грамадзянскай вайны. Некаторыя варочваюцца з фронту з ордэнамі Чырвонага сьцягу. Некаторыя ідуць працаваць на фабрыку, моладзь вучыцца на Рабфаку. У адчыненыя дзьверы зэлмэньянскага дому, забарыкадаванага знадворку кансэрватызмам, ўрываюцца струмені савецкага радыё і электрыкі, званкі новага трамвая ўзрывае тут застоеную багну. Старому дому надыходзіць канец. Сям'я Хвост траціць сваю ранейшую патрыярхальную замацаванасьць. Но вы побыт захоплівае ў зэльмэньянскім доме пазыцыю за пазыцыяй, старое адступае, руйнуецца, нішчыцца.

Галоўныя слупы сям'і Зэлмэнянэр—старога пакаленьня, гэта — дзядзькі Іча, Зіша і Юза. Няхай вас не непакоіць, што першы гадзіннічык, другі кравец, а трэці столяр—у іх жылах яшчэ стоўмаціць кроў старога кулацкага Зельмэлэ. І кожная спроба звонку—з савецкага шырокага асяродку—зрабіць у гэтым доме нейкую «рэформу» ня так лёгка ўдаецца. Нават радыё і электрыка зьяўляюцца не бясьпекай для зьдзічэлай кансэрватыўнай ідыліі абасобленай сям'і Хвост. Зішы і Юды, натуральна, становяцца супроць новага ладу.

Зноў жа «моладзь»—новае пакаленьне: міліцыянэр-камуніст Бэра, фабрычны рабочы Фоля, студэнты—яны адмяжаваліся ад старых і адносяцца да іх варожа. Але і варожасьць іхняя да «старых» нейкая сваясаблівая. З аднаго боку яны лічаць сваім абавязкам ператрансьляваць у гэты дом усё савецкае, а з другога боку, усе яны цішком, разам з Кульбакам, яшчэ любяць гэты зэльмэньянскі дом з яго дзядзькамі і цёткамі, паводзінамі і бытам...

3.

Праблему, якую тут паставіў перад сабою Кульбак адна з вельмі значных у змаганьня за сацыялістычнае грамадзтва: справа ідзе пра перараджэньне дробнай буржуазіі ў працэсе клясавага змаганьня. З пункту гледжаньня пралетарыяту трэба па рэвалюцыйнаму перамагчы ў дробнай буржуазіі яе кансэрватызм, яе рэакцыйнасьць.

«Дробны вытворца,—кажа Ленін,—вельмі церпіць ад мадэрнізаванага ладу, але ён стаіць з боку ад няпасрэдных, зусім адкрытых супярэчнасьцяў, баіцца іх і пацяшае сябе наіўна-рэакцыйнымі фантазіямі» (Ленін, б. 2, стар. 53). Гэтая рэакцыйная ідэалёгія, рэакцыйны ўтапізм дробнага вытворцы, пераходзяць у «спадчыну» ад капіталістычнага сьвету пралетарыяту,, калі апошні прыходзіць да ўлады і бярэцца будаваць новае бяскласавае грамадзтва. «Рэакцыйныя фантазіі» дробнага вытворцы, яго неразуменьне супярэчнасьцяй жыцьця ў клясавым грамадзтва з вялікай сілай націскаюць і на заўтра пасьля рэвалюцыі, пасьля таго як рабочая кляса ладзіць сваю дыктатуру; але пралетарская рэвалюцыя мае вялізныя ператраўліваючыя сродкі і ператраўлівае ўсё больш вызваляе яго ад утопій працоўнага дробнага вытворца ды набліжае яго да «няпасрэдных адкрытых супярэчнасьцяў» жыцьця і нарэшце ператварае яго ў чыннага змагара за сацыялізм.

Вось гэты самы працэс ператраўліваньня праз клясавае змаганьне Кульбак павінен быў паказаць у сваёй кнізе. Тады ён па мастацку ўзьняў-бы вялікую праблему.

У пэўнай меры Кульбаку ўдалося даць мастацкі паказ хісткай, перагружанай рэакцыяй, але не зьбянтэжанай пры ўмовах савецкай улады натуры дробнага вытворцы, працоўнага дробнага буржуа.

Што тычыцца паказу рэакцыйнай натуры дробнаўласьніцкага асяродку дык кніга Кульбака вельмі ўдалы твор пры ўсёй небясьпецы ідэалізацыі гэтага сродку. Кульбак вельмі добра ведае людзей гэтага асяродку, іх жыцьцё, круг іхніх інтарэсаў. Гэтыя рысы Кульбак дае густа. Малюнкі, якія паказваюць сілу рэакцыёнае спадчыны ў дробнай буржуазіі, зроблены вельмі выпукла.

Але Кастрычнікавая рэвалюцыя выводзіць працоўнага дробнага буржуа з тупіка, з пасыўнасьці і рэакцыі. Ці бачыць гэта Кульбак? Ці бачыць ён гэта як працэс, які нішчыць зэлмэньянскі лад жыцьця, і як будаўнічы, рэканструіраваны працэс у зэлмэньянскім асяродку? Электрыка, радыё, ліквідацыя няпісьменнасьці—усё гэта ёсьць. Але рэвалюцыйная пазытыўная сіла гэтых працэсаў паказана бледна, новыя пакаленьні, якія зьяўляюцца носьбітамі новай савецкай культуры пададзены бяскроўна, схэматычна. Паказваючы як зэлмэньянэр злучаецца на новыя парадкі, Кульбак не адчыніў для сваіх дзядзькоў шляху для пераробкі ў новых людзей сацыялістычнага грамадзтва. Нейкі фатальны лёс стварае Кульбак для «дзядзькоў», ён карае іх на вечную сацыяльную рэакцыйнасьць, альбо ў найлепшым выпадку—на вечнае хістаньне, назаўсёды скэптызм да «новых парадкаў».

Праўда, ня ўсюды Кульбак заставаўся пры гэтай фаталістычнай тэ-

Супроць вульгарызатарства за добраякасную крытыку

Я. БРАНШТЭЙН

Супраць вульгарызатарства

Пішу гэтыя радкі ня толькі з мэтаю азнаёміць чытача з невялікай кніжкай вершаў І. Шапавалава—маладога (бязумоўна, здольнага) паэта-пагранічніка.

Адначасова я хачу зьвярнуць увагу на выключны прыклад крытыкі не таварыскай, пратэнцыёзнай і антыпартыйнай—вульгарызатарскай.

Падобным сумным прыкладам лічу рэцэнзію А. П. Д. на кніжку вершаў Шапавалава (гл. «Зьвязду» № 218).

«Штампы і алілуя», «няўдала сплагіяваныя чужыя мысьлі», «халтурныя нікчэмныя брашуркі»,—няўжо такім наскокам можа вучыць і выхоўваць наш літаратурны маладняк?

Узяць-бы хоць для пачатку абвінавачваньня Шапавалава ў плагіяцтве чужых думак — якое нясусьветнае глупства!

Няўжо паэт Шапавалаў ня мае права цытаваць (вызначаючы сваю цытату лапкамі) таварыша Сталіна альбо той ці іншы партыйны лёзунг?.

Рэцэнзэнт лічыць падобныя цытаваньні злачынным «плагіраваньнем чужых думак», апроч гэтага яшчэ—«злачыннай, няўдалай вытрымкай,» бо бачыце-ж, у паэтычным тэксьце цытата Сталіна падпала, натуральна, дзеяньню рытму, рыфмы, а часамі сынтаксычнай інвэрсіі (перастаноўцы), што зьяўляецца натуральным для паэтычнага тэксту. Тэкст Сталіна «Не аднэй пядзі чужой зямлі ня хочам, але і сваёй зямлі, ні аднаго вяршка не аддамо» дэфарміраваны ў паэтычным тэксьце Шапавалава так:

«Чужой земли—
не хотим
ни пяди...
Но...
и своей земли
никому
не дадим».

У другім месцы ў тым-жа вершы той-жа тэкст, перадаецца наступным чынам:

«Чужой земли
не хотим
ни пяди,
Но
и своей земли,
вершка
своей земли
никому
не дадим.

Клясавы сэнс тэксту не зьмяніўся. Тут мы маем зьмену паэтычнага парадку. Можна прывесьці вялізарны лік прыкладаў, калі ў паэтычным тэксьце «чужыя думкі» растаўляюцца і падбіраюцца так, каб з іх атрымалася рыфма». Прыводжу прыклад з Маякоўскага, пад літаратурным уплывам якога знаходзіцца І. Шапавалаў. Маякоўскі піша:

«Переходило
от близких ближним,
от ближних
дальним взривало сердца
«мир хижынам,
война,
война,
война
дворцам».

Рэцэнзэнт «Зьвязды» лёгка можа пераканацца, што ў даным выпадку такія-ж «няўдалыя» вытрымкі робіць В. Маякоўскі, падбіраючы чужыя думкі, растаўляючы іх «каб з іх атрымалася рыфма». Заўважце, што замест тэксту: «мір хіжынам, вайна дварцам», мы атрымалі некалькі зьменены (рытарычным паўторам):

«война,
война, и
война дворцам».

У паэтыцы школы рускіх канструктывістаў, як вядома, ужываецца паэтычны мантаж гістарычных дакумантаў, лёзунгаў, тэзісаў. Няўжо-ж і іх рэцэнзэнт абвесьціць плагіатамі?

Ужо калі гаварыць пра нясумненныя адносіны да чужых думак і чужога тэксту, то варта з гэтым абвінавачваньнем зьвярнуцца да рэцэнзэнта. Рэцэнзэнт абвінавачвае Шапавалава ў тым, што ён—Шапавалаў—фармалістычны званар на падставе незразумелых рэцэнзэнтам радкоў:

«К словам
привыкаем мы —
Точно к вещам
всегдашним
и очень обычным.
Пускаем их
в ход,
Ничего
не
ища
за
их
звуковым
обличием».

Рэцэнзэнт прыпісвае на гэтай падставе Шапавалаву фармалістычную тэорыю пра тое, што «за словам нічога ня трэба шукаць». Ратуйце, увесь верш гаворыць пра адчуваемасьць сьціраючыхся ў быце слоў, гаворыць за тое, каб зразумець усю веліч слова «таварыш»,—а рэцэнзэнт «ничтоже сумняшеся» прыклейвае Шапавалаву значок фармаліста, для якога гук—самамэта!

На тэму пра «стирающиеся слова» пісалі шмат хто. Шапавалаў менавіта і выступае супраць таго, што

«И часто
«товарищ»
Звучит теперь
Истерто,
Тускло,
Обычно.

Паэт заяўляе, што «таварышом» ён называе ня кожнага,—што-ж у гэтым злачыннага?

Настолькі-ж лёгкадумна рэцэнзэнт бранчыць сваім мізэрным запасам дыялектычнага матэрыялізму, калі ён абвінавачвае Шапавалава ў разрыве адзінства аб'екту і суб'екту на падставе таго, што ў паказе паэта адсталы рабочы (які калечыць малаком мадэль вагі), зьяўляючыся аб'ектыўнай апорай клясавага ворага, «асабіста не зьяўляецца нашым ворагам».

І зусім правільна. І няма чаго тут грукацець ні к сялу ні к гораду дыялектыкай аб'екту і суб'екту!

Рэцэнзэнт «хоча адукаванасьць сваю паказаць» і ў запале гэтага імкненьня лічыць лішнім удумліва ўчытацца ў тое, пра што ён гаворыць. Вабраз адсталага рабочага з вершу «Об одном единственном ударе молотка» ператвараецца пад рукамі рэцэнзэнта ў вобраз... «абываталя—клясавага ворага». Усьлед за гэтай «апэрацыяй» рэцэнзэнт сумняваецца, чаму паэт прапануе «политехникумам і Втузам эту армию распулеметить»—армію тэхнічна адсталых рабочых. Паэт прапануе будаваць тэхнікумы і ВНУ для абываталяў!—Ускліквае рэцэнзэнт.

Дарэмны крык. Гэты крык настолькі-ж дарэмны, як і крык пра трацкісцкі курс Шапавалава наконт моладзі (моладзь, як баромэтр). Гэта абвінавачваньне рэцэнзэт будуе на наступных радках Шапавалава:

Приказ
молодежи сегодняшней стройки
победу вершить
Ленин отдал.

У гэтай страфе, як зразумела для кожнага, гаворыцца толькі пра тое, што моладзь, адданая заветам Леніна, павінна перамагчы.

Наступная страфа гаворыць пра тое, што перамогу моладзь атрымала з рук старшых:

«Но у старших, из рук
получивши ее,
О них
забываем
подчас мы».

Трацкісцкая тэорыя пра моладзь як пра баромэтр тут ня прычым. Ці магчымы-б былі пры ўдумлівым чытаньні падобныя казусы?

А бяз уменьня чытаць мову паэзіі бяз літаратурнай пісьменнасьці таксама не абыйдзешся.

Рэцэнзэнт зусім пазбаўлены здольнасьці чытаць паэтычную страфу, паэтычную мэтафару, гіпэрбалізацыю вобразу ён перетварае ў прадмет сваёй насьмешкі.

Ці магчыма пісаць, што «мысьлі бягуць рысакамі»?

І можна і патрэбна, калі, прыкладам, стаіць такая задача, якая стаяла перад Шапавалавым. У вершы «На смерть Маяковского»—паэта, які абвясьціў «наш бог—бег», паэта ўрбаністычнай дынамікі, паэта, на сьмерць якога паэт Пастэрнак пісаў: «Он спит со всех ног», жадаючы гэтым падкрэсьліць дынамічнасьць Маякоўскага,—у падобным вершы зусім магчыма прыстасаваць незвычайны і дзіўны для рэцэнзэнта, але блізкі для лексычнай і вобразнай сфэры Маякоўскага—вобраз. І нечага тут зубаскаліць.

Таксама спробай гаварыць паэтычнай мовай зьяўляецца наступны Шапавалаўскі радок, які выклікае прэтэнцыёзны крык рэцэнзэнта:

«Кровь
второй пятилетки
бежит
по нефтяной аорте.
Сталинградский
победу
гудками высвистывает.
Но...
живого
хватает мёртвый.
Через дыру
в собственном кармане
— Он
на мир
не смотрит иначе,
«5 в 4»
его не манят».

Рэцэнзэнт зьдзекуецца над вобразам: «через дыру в собственном кармане». Ён ехідна прапануе зьвесьці праблему перамаганьня перажыткаў капіталізму ў сьвядомасьці, (а пра гэта, і толькі пра гэта гаворыцца ў гэтай страфе!) да зашытай «дзіравай» кішэні. А «ларчик» проста адчыняецца. Глядзець на сьвет праз дзірку ў уласнай кішэні—гэта паэтычны вобраз прыгнёту «перажыткаў капіталізму ў сьвядомасьці». Бязумоўна—удалы вобраз.

Згадайце хаця-б, як Маякоўскі (у якога Шапавалаў вучыцца) даў вобраз мешчаніна, які глядзіць на сьвет праз прызму сваіх «галіфэ».

Эх,
и заведу я себе
Тихоокеанские галифища,
Что-б из штанов
выглядывать
Как коралловый риф».

Таксама, бязумоўна, удалым зьяўляецца тое мейсца ў Шапавалава (размова з «былым»), дзе паэт (зьдзекуючыся над разгубленасьцю доктара, непакойліва ёрзаючага на крэсьле і нэрвова пускаючага праз фіранку дым) гаворыць яму:

«Да, да, да,
Я вас помню,
У вас
геммором аткрывается
от одного слова
«демонстрация».

І няма чаго туту зьдзеквацца над «мэдыцынскімі здольнасьцямі аўтара»—аўтар ужыў тут «злы» вобраз, які нярэдка ўжываецца ў такіх выпадках. Нагадаем хаця-б зноў Маякоўскага:

«Намозолив от пятилетнего сидения зады
Крепкие как умывальники».

Так піша Маякоўскі ў сваім вершы «О дряни». А спрабаваў-бы рэцэнзэнт з прычыны гэтага вобразу «с'острить», што, моў, «аўтару лепш вядома, ці моцны зад як умывальнік, ці не»...

Рэцэнзія літаральна кішыць падобнымі недарэчнасьцямі. Дрэнна вышла. Зусім дрэнна, таварыш А. П. Д.

Ці патрэбна маладому паэту Шапавалаву крытыка?

Патрэбы няма даводзіць гэтага.

Шапавалаў знаходзіцца пад моцным уплывам Маякоўскага—тут яго моцны, але і слабы бок. Някрытычная вучоба ў Маякоўскага, павярхоўнае падражаньне яго літаратурнай тэхніцы можа зрабіцца небясьпечнай.

Рытарычны пафас Маякоўскага багаты для пачынаючага небясьпекай голага публіцыстычнага мітынгаваньня. Устаноўка Маякоўскага на разгаворную мову багата небясьпекай празаіраваньня паэтычнага радка.

Гіпэрбалізацыя вобразу ў сэнсе Маякоўскага пагражае пачынаючаму паэту крыклівасьцю і хадульнасьцю. Вядомая «ломка сынтаксу» па Маякоўскаму асабліва небясьпечна для маладняка (пагражае злачыннасьцю супраць законаў граматыкі). Усё гэта правільна. Гэтая небясьпека сустракаецца ў Шапавалава.

«Победу вершить Ленин отдал»
або:

«Ты мира из «завтра армии» і г. д. грэшаць ломкай сынтаксу не на карысьць паэтычнай страфе. Праізвольная—страфа (нават там, дзе гэта не патрабуе разгаворная інтанацыя) непатрэбна.

Рытарычнае шматслоўе стрымлівае разгортваньне паэтычнага сюжэту там, дзе патрабуецца ў большай меры ня публіцыстыка, а паказ вобразу, у практыцы, праз псыхіку (такі, напрыклад, верш «Об одном единственном ударе молотка», «Первомайский несостоявшийся разговор з бывшим» «Война где там»).

Надмерна для такога маленькага зборніка вершаў безьліч літаратурных маніфэстаў (у падражаньні Маякоўскаму).

Аднак, было-б нясправядлівым замоўчаць пра шэраг удалых рыфм, вобразаў, строф і цэлых вершаў, дзе клясавы тэмпэрамант, нянавісьць да ворага і ўдалыя спробы абагульненьня аднаго факта (у вершах «Мы беспартийные...—наше дело сторона». «Об одном единственном ударе молотком»), спробу ўвесьці чоткую ваенную мову ў паэтычны радок таксама патрэбна вітаць. І Шапавалаў павінен вучыцца, вучыцца і вучыцца для таго, каб стаць на самастойныя творчыя ногі, але ён зусім мае рацыю заявіць.

Где написано,
Чтоб работал я,
А о работе писал
иногда не понимающий в ней
нибельмеса».

Патрэбна дапамагчы нашаму літаратурнаму маладняку самому пісаць пра сябе.

Дапамагчы, а ня біць абухом па гаве.

БАРЫС МІКУЛІЧ

Абзацы пэтытам

Есьць вялікая і цяжкая тэма: паказ пераробкі інтэлігенцыі ў рэвалюцыі, у сацыялістычным будаўніцтве. Яшчэ ў ранейшых сваіх апавяданьнях (прыкладам «Чорная вірня») я ўзяўся за гэту тэму—больш блізкую мне, больш знаёмую і зразумелую. Усе наступныя мае работы—«Наша сонца», «Ускраіна» — трактуюць гэтую-ж тэму. Брагін—у «Чорнай Вірні», Шастакоў—у «Нашым сонцы», Крэйсьлер—у «Ускраіне»—тыпы аднэй сацыяльнай катэгорыі. І менавіта, выходзячы з таго, наколькі ўдалося мне раскрыць гэтую асноўную тэму, ацэньваю я свае дасягненьні. Іх у «Нашым сонцы» ня шмат, у «Ускраіне» і «Рот фронце»—болей.

Цяпер я выразна бачу, што мэтад «Нашага сонца»—ня credo, а толькі экспэрымэнт. Можна спрачацца пра вынікі гэтага экспэрымэнту, але для мяне ясна: «Наша сонца» прынесла мне плюсы, праўда, можа не шматлікія. Мне ўсё-ж удалося больш-менш рэльефна паказаць прафэсара Шастакова, гэтага прадстаўніка аджываючай рэакцыйнай інтэлігенцыі, апалёгета так званай «чыстай навукі». І распрацоўваючы ў «Ускраіне» вобраз Эдуарда Крэйсьлера, у мяне было ўжо больш упэўненасьці,—вобраз атрымаўся, здаецца мне, мацней за вобраз Шастакова, тут ўжо вызначаецца пэрспэктыва псыхолёгічных зрухаў, якой ня было і не магло быць у Шастакова. З другога боку—у «Нашым сонцы» я хацеў паказаць прыход да камсамолу Шастакова-сына, таго, як камсамол перарабляе дробнабуржуазную прыроду яго, як у гэтай пераробцы бываюць рэцыдывы. Гэта—кожнаму ясна. Ва ўсёй кнізе, ад пачатку да канца, відна пэрспэктыва для перавыхаваньня Шастакова-сына і яму падобных.

Аднак, гэтым я зусім ня хочу зацямніць тых памылак, якія ёсьць у аповесьці, я іх бачу, усьвядоміў удзячны кожнаму, хто іх дапамагае мне выправіць.

Я пераходжу, такім чынам, да крытыкі. Будзе зусім ня лішнім адзначыць, што напісаныя мною кнігі «Удар», «Чорная Вірня» «Наша сонца», «Ускраіна» ня мелі разгорнутае таварыскае крытыкі. Гэта ня скарга, а факты. Нельга лічыць крытыкай ня сур'ёзныя абзацы пра мяне ў артыкуле А. Сучковай «За сапраўдную творчую перабудову» («Зьвязда» ад 5 верасьня 1932 г.), дзе кідаюцца сур'ёзныя абвінавачаньні накшталт таго, што «Наша сонца» мае рад клясава-варожых установак*). Карыстаючыся дадзенай мне магчымасьцю, заяўляю, што, не адмаўляючы няўхільных памылак, аповесьць «Наша сонца» нічога агульнага ня мае з выдуманымі А. Сучковай «уплывамі капіталістычных элемэнтаў», якія нібыта ёсьць у маёй кнізе. Памылкі ня ёсьць устаноўкі, і, нарэшце, не па адных толькі асобных памылках ацэньваецца той ці іншы твор.

Гаворачы пра крытыку, мне няўхільна прыпамінаюцца словы Оскара Уальда пра тое, што крытыка—гэта аўтабіяграфія крытыкаў. Да шматлікіх крытыкаў гэта можна дапасаваць і цяпер. І сапраўды: дзесяткі маладых пісьменьнікаў ня маюць разгорнутай сур'ёзнай прапрацоўкі напісанага імі. Я—ня выключэньне. Горш таго, калі вышла мая першая кніга «Удар», я апынуўся ў дзікаватым становішчы. Пра кнігу напісалі скупа, а галоўнае—гэтыя тры-чатыры рэцэнзіі рэзка разыходзіліся ў ацэнках. Што тут зробіш? Значыць, не пра колькасьць крытыкі ідзе гаворка, але—галоўнае—пра якасьць яе. Трэба-ж прыслухоўвацца да пісьменьніка. Прачытаеш адзін раз агульныя развазжаньні крытыка, падзівішся, якім «вучоным шчілем» ён гаворыць з табой, а ў другі раз—кінеш, не дачытаўшы, і застанецца прыкрасьць, нездаволенасьць. Калі мы цяпер гаворым пра стварэньне творчай атмасфэры для пісьменьніка, дык гэта таксама стасуецца крытыкі, іхняй чуласьцю, іхняга ўменьня працаваць. Дужа трапна ў свой час сказаў Ільля Сельвінскі: «Критика гигиена поэта, его совесть, здравый смысл, чуткий товарищ, устроитель яго творческих судеб, возбудитель поэтической бациллы» (Литгазета № 1 за 1929 г.).

Гэтакай крытыкі хочацца.

Цяпер я буду працаваць над аповесьцю «Як рассыпаецца граніт» (назва ўмоўная), дзе аднэй з асноўных тэм зьяўляецца гібель авангардызму. На канкрэтных фактах і людзях, я хачу паказаць, як мага паўней ролю камуністычнай партыі, у прыватнасьці — ролю камуністычнай партыі ў кіраўніцтве камсамолам, у справе выхаваньня маладога пакаленьня.

Гэтай работай хочацца хоць часткова ліквідаваць творчую запазычанасьць перад камсамолам, хочацца падсумаваць здабытыя ў папярэдніх работах плюсы.

*) Між іншага, аўтар артыкулу апэрыруе выдуманымі ім фактамі пра тое, нібы кнігу на творчай дыскусіі лічылі чырвонай халтурай.

Х. ДУНЕЦ

Трэба зьмяніць стрыжань!

(Нататкі пра творчасьць Б. Мікуліча)

Беларуская літаратура ўсё больш адлюстроўвае працэсы сацбудаўніцтва, на ёй усё больш яскравай робіцца сьлед ідэёва-творчых шуканьняў, накіраваных да выяўленьня ролі пралетарыяту і яго авангарду—кампартыі ў рэвалюцыі, ролі камсамолу, пераробкі працоўнага сялянства і гарадзкой дробнай буржуазіі.

Б. Мікуліч належыць да тае групы пісьменьнікаў, для якіх стымулам творчасьці зьяўляецца сацыялістычная **пераробка** БССР. Ён лічыць за сваю асноўную творчую задачу паказаць **перараджэньне старой інтэлігенцыі** ва ўмовах савецкага ладу. У яго галярэі вобразаў досыць прадстаўлена інтэлігенцкая праслойка. Мікуліч спрабуе пранікнуць у побыт гэтай інтэлігенцыі. Але ўсётакі, ня гледзячы на гэта, я павінен сказаць, што Мікуліч шчасьлівым «выпадкам» на справе ўсё больш ухіляецца ад гэтае свае ўлюбёнае задачы і робіць крокі да таго, каб паказваць у сваіх творах камсамол. Слова «выпадкам» я бяру ў двукосьсі, бо выпадковасьць тут ўмоўная. Я кажу пра «шчасьлівую выпадковасьць», бо лічу, што Мікуліч добра робіць, калі «пакідае» прафэсароў, інжынэраў і ўвесь аксэсуар іх быцьця і побыту, а замест гэтага малюе жыцьцё і змаганьне камсамолу.

Справа вось у чым. Побыт старой інтэлігенцыі, яе ідэёвае жыцьцё, яе псыхолёгічныя зьвіліны—усім гэтым яшчэ вельмі слаба авалодвае Мікуліч. Пісьменьнік павінен дасканала ведаць жыцьцё тых людзей, пра якіх ён піша. Самы нікчэмны інтэлігент, самы мізэрны наццэмаўскі прафэсарышка, самы «сярэдні» хлюпік з інтэлігенцкага асяродзьдзя, — кожны такі «экзэмпляр» прайшоў свой своеасаблівы жыцьцёвы шлях, які вынікае з жыцьця тае клясы, якую абслугоўвае гэтая праслойка інтэлігенцыі. Каб праўдзіва паказаць якую-небудзь названую тыповую групу, трэба вялікае веданьне фактаў, гістарычнага матар'ялу, псыхолёгіі і побыту гэтае праслойкі.

Калі так падыйсьці да твораў таварыша Мікуліча, дык будзе зразумелым, што тут імкненьні пісьменьніка маюць вельмі слабы посьпех. Характэрнай ілюстрацыяй да гэтага зьяўляецца першая частка кнігі «Наша сонца»—«Кірункі вятроў». Хіба можна задаволіцца тым паказам «душэўнага сьвету» і дзейнасьці ворагаў рэвалюцыі з асяродзьдзя буржуазнай прафэсуры, распаду сям'і гэтага асяродзьдзя, які даецца тут? Бязумоўна, не. Прафэсар Шастакоў выкраены па вядомай схэме, ён кінэматографічна-абрыўчата мігаціць перад нашымі вачыма, усе аксэсуары, якія ствараюць асяродзьдзе і бытавую атмасфэру гэтага прафэсара нагадваюць тое, што мы не адзін раз бачылі ў творах пісьменьнікаў папярэдніх пакаленьняў.

Тут нас інады хвалюе рыса сучаснага контррэвалюцыянера, але гэтыя пасобныя рысачкі не ствараюць вобразу. Адчуваецца, што аўтар ня мае належнае падрыхтоўкі для распрацоўкі такога матар'ялу і такіх тэм.

Ды хіба трэба было Мікулічу пачаць з гэтага канца? Другая частка той-жа кнігі «Наша сонца» пераканаўча паказвае, што яму «лепей відаць», што робіцца ў камсамольскім асяродзьдзі. Частка аповесьці «Наша сонца» пад назваю «Дваццаць адзін»—гэта лепшае, найбольш пераканаўчае і правільнае, найбольш «чытабельнае» і карыснае з усяго таго, што напісаў таварыш Мікуліч. І гэта не выпадкова—гэта таму, што мястэчковы камсамол з яго жыцьцём і змаганьнем Мікулічу больш блізкі і вядомы, ніж навакольле абломкаў буржуазнай інтэлігенцыі, якая жыве ў савецкіх умовах.

Вышэй адзначаная «выпадковасьць» таму зусім невыпадковая. Кожны, хто паспрабуе адказаць на пытаньні, чаму лепшай, найбольш цікавай, найбольш правільнай і сацыяльна-насычанай у кнізе «Наша сонца» зьяўляецца частка «Дваццаць адзін», той вымушаны будзе прыйсьці да выніку, што тут Мікуліч найменш хадульны найбольш натуральны і таму ён тут больш, як у другіх мясцох, умее абрысаваць людзей і іхныя учынкі, тут яму больш удаецца пабудова рэчы, разьмяшчэньне свае ўвагі, разьвіцьцё фабулы; тут менш, як у іншых мясцох, можна заўважыць экспэрымэнтатарства ў пільнякоўскім стылі: перасячэньне роўніц, наплывы, «філёзофскія» лірычныя адступленьні, паўторы, захапленьне рытмікай, якая нічога не гаворыць і мілагучнасьць у стылі: цемнач цягнецца ценкай цырагай... цвыркун цырлікае, бы цырчыць цурок» і г. д. і г. д.; слоўная эквілібрыстыка, надуманыя вобразы—усе тое, чым перапоўнена першая і часткова трэцяя частка «Нашага сонца», адступаюць на апошні плян тады, калі Мікуліч бачыць перад сабой добра знаемае асяродзьдзе, жывых людзей, блізкіх камсамольцаў, узаемаадносіны і побыт гэтага асяродзьдзя. І трэба сказаць, што ня гледзячы на шэраг небясьпечных праблем якія аўтар ставіць ў гэтым абасобленым апавяданьні «Дваццаць адзін», Мікулічу ўдалося справіцца са сваёю задачай—паказаць перамаганьне дробнабуржуазных традыцый і ўплываў на камсамол, — перамаганьне праз актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве. Добра паказваючы камсамол мястэчка, Мікуліч у гэтай частцы лепш справіўся з паказам клясавага ворага (рабін Калмановіч і яго жонка, дзейнасьць Кранцэвіча), чым з абрысоўкай прафэсара Шастакова і да яго падобных.

●

Я яшчэ раз пераканаўся ў правільнасьці вышэй выкладзеных думак, калі прачытаў апублікаваную ў «Маладняку» досыць значную частку новай аповесьці Мікуліча—«Ускраіна» «Ускраіна» зусім новы твор паводле тэматыкі і тыпажу; тут не чатыры сьцяны прафэсарскае кватэры і не мястэчка стаць у цэнтры, а вялікае будаўніцтва на ваколіцы гораду. Кідаецца ў вочы страшэнная расплывучатасьць рэчы, награмаджэньне пэрсанажу, эскізнасьць абрысоўкі людзей, незаконны «ўраўнілаўскі» падзел увагі пісьменьніка паміж асобнымі групамі людзей—словам: відаць, што таварыш Мікуліч яшчэ нявыстарчальна арыентаваны ў новым матар'яле, слаба паказвае рабочых і актыў на будаўніцтве, хістаецца ў выбары праблемы для свайго сюжэту: то чытачу здаецца, што гэтай праблемай зьяўляецца знаёмы нам буржуазны інтэлігент, але ў новай вопратцы архітэктара, то, як быццам, намячаецца праблемай пытаньне зьдзельшчыны і г. д. У кожным разе адно моцна выпірае ў гэтай новай рэчы Мікуліча: тэндэнцыйная (у простым сэнсе) цяга да інтэлігенцкага пэрсанажу і да абмалёўкі мяшчанскае абстаноўкі. Ізноў-ткі скажу: гэта быў-бы ня грэх, калі-б Мікуліч авалодаў гэтаю тэмай і калі-б ён ня бачыў перад сабою другога, больш усьвядомленага з яго боку на практыцы матар'ялу. Бо ўжо і ў гэтай аповесьці відаць, што паказ камсамолу і наогул моладзі на будаўніцтве быў-бы для Мікуліча больш удзячным і зразумелым, чым Крэйслеры і Сінічкіны.

Са сказанага вынікае: Мікулічу трэба зьмяніць свой тэматычны-творчы стрыжань: ня інтэлігенцыя, а рабочая моладзь павінна стаць у цэнтры ўвагі ягонае творчае працы. Гэта ня значыць, што Мікуліч не павінен зусім ставіць праблему перараджэньня інтэлігенцыі, не павінен паказваць людзей кшталтам Шастакова і Крэйслера. Не. Але цэнтр цяжару трэба перанесьці на больш знаёмыя, я нават сказаў-бы выпакутаваныя пісьменьнікам, праблемы. Тады творчасьць Мікуліча набудзе больш рэальных фарб, натуральных эмоцый і пачуцьцёвую сілу.

●

Элемэнты надуманасьці і мудрагельства пакінулі свой сьлед на стылістычных прыёмах Мікуліча. Я ўжо падаваў падобныя прыклады. Прычыну гэтае штучнасьці, гэтага «экспэрымэнтатарства» я зноў-ткі бачу ў тым, што Мікуліч яшчэ ня здолеў правільна абраць аб'ект свае творчасьці, ці абраў гэты «аб'ект» памылкова з-за нейкае «ідэі фікс». Можа Мікулічу проста падабаецца «праблема інтэлігенцыі» з-за літаратурнае інэрцыі: займаліся-ж цэлыя пакаленьні пісьменьнікаў тым, што трактавалі на розны лад постаці «крытычнае асобы». Здаецца, што менавіта такога роду традыцыі бытуюць у маладога Мікуліча і яны ствараюць штучнасьць абранае ім праблемы і таму—часамі мудрагельства пры абраньні мастацкіх сродкаў.

Адзначаючы гэтыя ідэёвыя і стылістычныя абмахі, трэба, бязумоўна, падкрэсьліць: у Мікуліча няма ідэалізацыі узятае ім за тэму буржуазнае наццэмаўскае інтэлігенцыі. Колькі-б ня было недахопаў у апавяданьні пра старога Шастакова, у абмалёўцы пэрыяду Беларускае Рады і г. д., тут ня можна знайсьці варожых настрояў пісьменьніка. Таму необгрунтованая заява Сучковай у яе артыкуле ў «Зьвяздзе» пра варожасьць Мікуліча павінна быць асуджана. Хіба такім чынам мы можам вучыць і выхоўваць маладыя пісьменьніцкія парасткі? Прылепіць ярлычок «варожы» дужа лёгка, але ў такой-жа ступені безадказна і шкодна, калі гэта ня мае падставы, калі пры гэтым зусім забываецца шлях пісьменьніка і яго грамадзкае месца калі такія заявы робяцца зусім неаб[illegible] такая «крытыка» ня есьць рэцыдыў мэтаду шэльмаваньня і налепліваньня ярлыкоў пры кожным жыцьцёвым выпадку!

●

Мікуліч, бязумоўна, належыць да таленавітае групы пісьменьнікаў і ён, бязумоўна, наш, ня гледзячы на яго асобныя памылкі палітычна-творчага парадку. Мікуліч мае рацыю, калі ён экспэрымэнтуе, бо трэба-ж што-колечы ахвяраваць на творчую вынаходніцкую рызыку; адначасна будзем вымагаць ад Мікуліча, каб ён карыстаўся гэтым экспэрымэнтатарствам ня пераборшчваючы, на карысьць літаратурнае справы. Будзем вымагаць ад Мікуліча паказу камсамолу пад кіраўніцтвам партыі, на рыштаваньнях нашых пабудоў, у працэсе нараджэньня новага сацыялістычнага побыту...

орыі пра сваё зэльмэньнянскае старое пакаленьне. Робячы пры гэтым біялёгічны падзел свайго пэрсанажу, Кульбак мейсцамі набліжаецца аднак да правільнага зразуменьня клясавых працэсаў у нашай краіне ў іхнім адлюстраваньні на зэлмэньнянскім асяродку. Пры гэтым самы выпуклы акурат не паказ моладзі і нават не сярэдняе саветызаванае пакаленьне, а менавіта паказ хістаньняў кансэрватыўнага працоўнага элемэнту да Кастрычнікавай рэвалюцыі. Тут Кульбак наблізіўся да разуменьня працэсаў перараджэньня; пералому; хістаньняў Ічаў і Зішаў.

Калі Кульбак дае малюнкі зэлмэньнянскіх дзядзькоў, іхняе хістаньне пры ўмовах савецкай сапраўднасьці, ён набліжаецца да ўасабленьня нашай штодзённай практыкі. Але пакуль што Кульбак дае толькі эпізоды гэтага. Кепска тое, што гэтыя вострыя рысы ён прыкмячае яшчэ як роўнаважныя ўва ўсім жыцьці і побыце, зэльмэньнянэраў, кепска і тое, што яго сымпатыя яшчэ ня поўна вызначана да тых, якія хіляцца да пралетарыяту і тое, што ў аўтара яшчэ няма досыць моцных аргумэнтаў супроць кулацкіх дзядзькоў.

Так Кульбак бачыць цяжкі шлях гарадзкога дробнага вытворцы, больш адсталага, які ідзе аглядаючыся і скэптычна да перамогі свайго ўласнага клясавага нутра, каб узьняцца вышэй, да пралетарыяту. Гэта самае цікавае і самае сур'ёзнае ў «Зэлмэньнянэр», гэта адзнака дасягненьняў у творчасьці Кульбака на даным этапе і адзнака яго напружаньняў да сваёй уласнай перабудовы. Застаючыся на даным этапе на пазыцыях яго моцнай дробнаўласьніцкай клясы на хісткіх пазыцыях—Кульбак адчуў ход рэвалюцыі пачынае набліжацца да яе, каб у яе ўключыцца.

4.

Кульбак бездапаможны, калі малюе нашу моладзь, калі хоча паказаць камуніста. Кніга «Зэлмэньнянэр» напісана ў першыя два гады жыцьця Кульбака ў Савецкім Саюзе. Да таго часу Кульбак зусім ня ведаў нашага жыцьця-быцьця, ён ня знаў матар'ялу жыцьця і не разумеў новага чалавека, які выгартваўся ў гады Кастрычнікавай рэвалюцыі. Што такое камуніст у Савецкім Саюзе? Што такое наша моладзь? Гэта зусім новы чалавечы матар'ял і яго ня вывучыш толькі з кніжак, яго нельга ўявіць сабе абстрактна, трэба бачыць яго на практыцы, трэба мець перад сабою увесь шырокі малюнак нашага змаганьня, каб бачыць камуніста і перадавую моладзь у ім. Кульбак усяго гэтага яшчэ ня меў, ён не ацаніў ролі гэтага пласта ў грамадзкім жыцьці, ён у гэта ня выстарчальна ўдумаўся, таму ён на «саматужніцкі лад» уявіў сабе гэты пэрсанаж, часта браў яго натуралістычна-эмпірычна, не заўважаючы тыповага, не апрацоўваючы яго грунтоўна.

Вось камуніст Бэра. Відаць, што Кульбак хоча яго паказаць з усімі дадатнымі бакамі, якія камуніст павінен мець. Але гэта аўтару не ўдаецца, бо дадатныя бакі застаюцца зэлмэньняўскімі, а ня нашымі. Камуністычнасьць Бэры не паказана, бо камуністычнасьці не пакажаш на тым, як чалавек ёсьць, а не жарэ, п'е, а ня п'янствуе, вельмі эграбна сварыцца з хатнімі і д. т. п.—трэба яго паказаць як перадавы сацыяльны суб'ект, як дзеяча ў калектыве і ў імя сваёй клясы.

Альбо моладзь. Кульбак паказвае моладзь эскізна, натуралістычна, эпізодычна,—атрымліваецца бледна,—Мы ня бачым савецкага студэнта.

Гэтае новае ў зусім вялікай меры перагружана старым і вылазіць з-пад тоўстай скуры старога зьместу і старых формаў...

І хаця Кульбак пачаў бачыць у зэльмэньнянскіх пластах новыя сацыяльныя працэсы і бытавую ломку, што зьяўляецца непасрэдным вынікам пралетарскай рэвалюцыі і новага побыту дык ўсё гэта ў яго яшчэ моцна пераблытана з біялёгічнай, стыхійнай, фізыялёгічнай матывіроўкай, біялёгічным фаталізмам, бунтарскасьцю наогул, што моцна нагадваюць «Мошыях Бэн Эфроім» «Буня і Бера» ды інш. з яго ранейшых твораў. Вось прыклады, як Кульбак бярэ для сваіх праяў наогул, і для саветызаваных замест сацыяльных характарыстык—чыста фізыялёгічна-біялёгічна, адкідваючы гэтым сацыяльныя праблемы і ролю клясавага змаганьня. Кульбак піша:

«Зэльмэньняны чорныя, касьлявыя з шырокімі нізкімі ілбамі. У зэльмэньняна мясісты нос. У зэльмяньняна ямы ў шчоках. Зэльмэньняны набылі ў працягу пакаленьняў свой уласны пах—нейкі мяккі водыр заляжалага сена з яшчэ нечым...» (стар. 6).

Гэта бадай цалкам даецца замест сацыяльнай характарыстыкі. Ня людзей, якія жывуць і зьяўляюцца прадуктам клясавага грамадзтва, але жывёлін бачыце перад сабою.

Альбо пра Бэру камуніста:

«Вось маладзец асілак, маўклівы гарбар, у часе грамадзянскай вайны ён у бойках ля Казані атрымаў ордэн Чырвонага сьцягу за сваю халодную зэльмэньнянскую сілу» (стар. 13).

У Кульбака ў «Зэльмэньнянэр» засталася выпуклая лінія, што «дзядзькі» гэта сваясаблівы гатунак людзей, што іх дзеці ня маюць ніякага дачыненьня да клясавай прыналежнасьці і клясавага змаганьня. А калі ў многіх мясцох біялёгічная стыхія ўзята ізалявана ад сацыяльнага жыцьця, дык разьдзел «Дзядзька Юда» цалкам выпаў з кантэксту рэальнай, матэрыяльнай сапраўднасьці. Людзкія дзеі тут цалкам атуляюцца ў змрок містычнай місіі, замест жывога зэльмэньняка Кульбак паказаў тут «хадака», які вандруе па калгасах з містычнай мэтай—зусім на манэр «Буні і Бэра». У гэтым разьдзеле ярка відаць расшчэпленасьць Кульбака: відаць, што ён хацеў пажартаваць з яўрэяў, напалову шалёнага «блазна», аднак таксама добра відаць, што Кульбак адносіцца з цёплым пачуцьцем да гэтага лятуценьніка «хадака». Дзеля гэтага ў выніку атрымліваецца, што Юда і яго «калгасная місія» даюць скрыўлены малюнак калгаснага руху.

Так у Кульбака злучаюцца біялёгічныя моманты з мэтафізычна-містычнымі пры новай тэндэнцыі вызваліцца ад гэтага й даваць паказ рэвалюцыйных зьмен у грамадзкіх адносінах, людзкіх дзеях, як вынік кастрычнікавай рэвалюцыі. Новае ёсьць, але цяжар старога ўсё яшчэ цісьне з вялікаю сілаю і часта зьмяншае вартасьць рэвалюцыйнага напружаньня Кульбака.

З гэтым злучана і тое, што ранейшы «зэльмэньнянскі стыль», які Кульбак павінен быў перамагчы ў гэтай кнізе, застаўся ў вялікай меры, пісьменьнік яго не ўзарваў. Ён заўсёды хіліцца да стыхійных, індывідуальных, містычных і прымітыўных бакоў сваіх «зэльмэньняў», ён ня бачыць грамадзкай школы людзей і базуецца на інстынктыўнай і фізычнай сіле.

Гэта паказвае, што пісьменьнік «спадарожжа» ў нас павінен быць узброеным ня толькі шчырым жаданьнем і чыста-мысьлевай рэвізіяй сваіх імкненьняў. Трэба ідэалёгічная «пераацэнка каштоўнасьцяй», але пры гэтым таксама трэба пры сьвятле жывой практыкі, рэвалюцыйнай практыкі рабочай клясы пераацэньваць стары багаж. Каб гэта практыка была вывучана Кульбакам, зэлмэньняны ў яго інакш выглядалі-б, ён бачыў бы інакш Бэраў і Фоляў, ён бачыў бы іх зьвязаных з шырэйшым рабочым асяродкам, ён тады не абмураваў-бы дом зэлмэньнянаў высокай сьцяною, над якою, толькі дзякуючы радыё і электрычнасьці працягваюцца сюды ніткі рэвалюцыі... Коратка: «рэканструкцыя» зэлмэньнянаў была-б тады паказана як зьявішча сацыялістычнай рэканструкцыі.

5.

Аднак Кульбак можа перамагчы сваю расшчэпленасьць, свае супярэчнасьці. У творы «Зельмэньнянэр» ён пачаў гэтае змаганьне, хаця не з патрэбнай рашучасьцю. Кульбак шмат працуе над кнігай, вывучае гістарычны матэрыялізм і стараецца сам перамагаць Кантаньянскія, Фэрбахаўскія і Шопэнгаўэраўскія ўяўленьні, якія ў яго жылі разам з імкненьнямі, вычэрпанымі з кабалістыкі і стара-яўрэйскай схалястыкі. Кульбак у «Зельмэньнянэр» паказаў у шэрагу спроб, што ў яго ёсьць грамадзкі тэмпэрамэнт, які цяпер асэнсоўваецца і асьвятляецца праз ідэю савецкай улады. Кульбак у «Зэльмэньнянэр» пачаў пераапрацоўку свайго моцнага пачуцьця да прыроды і свой нахіл да філёзофіі ў такім кірунку, каб гэта было зьвязана з працэсамі нашай рэвалюцыі. Гэта можна зрабіць толькі матэрыялістычна-дыялектычным спосабам, такім чынам, пры якім ускрываюцца ўсе суадносіны паміж прыродай і чалавекам, чалавекам і грамадзтвам, матэрыяй і ідэяй, клясавым змаганьнем і клясавым ідэалам на фоне галоўных мэт, якія ставіць перад сабою пралетарыят. Кульбак пачаў з вялікім спазьненьнем. Пакуль што ён даў кнігу тыпова спадарожніцкую і г. зн. такую кнігу, якая паказвае, што ён становіцца на шлях спадарожніцтва з пралетарыятам, але стары Кульбак яшчэ пакуль што не разброены, новы Кульбак яшчэ ня ў поўнай меры ўзброіўся. Гэта самае яшчэ адчуваецца ў апублікаваных фрагмэнтах яго новай паэмы «Чайльд Гарольд з Дзісны», дзе ёсьць яўнае імкненьне вызваліцца ад буржуазных уплываў.

Мастацкае майстэрства Кульбака бяссумненна. Яно пакуль што разгортваецца не на ўзроўні рэалістычна-аб'ектыўнага паказу грамадзкіх канфліктаў, але ў спрабаваньні выкрыцьця [illegible] ды у паказе прыроды часта праз вэлюм пантэістычнай містыкі Сьпінозы. Багатая тэхніка Кульбака мае высокую кваліфікацыю. Малюнкі прыроды даюцца моцныя, поўныя фарбаў, нутранай сакавітасьці. Людзі паказваюцца буйнымі, плямістымі, але каляровымі штрыхамі. Хаця кніга «Зэльмэньнянэр» напісана ў эпічна-гумарыстычным, часта нават у нігілістычна-абыякавым наглядальным тоне, аднак ёсьць моцная эмацыянальная афарбоўка малюнкаў. Там, дзе Кульбак узвышаецца да сацыяльных успышак, яго эпічны тон раптам афарбоўваецца ў урачыста-патэтычную эмоцыю. Ляканічнасьць і адшліфаванасьць слова зьяўляюцца характэрнай рысай кнігі: гэта ў малюнку прыроды, у абмалёўцы тыпу, у сэнтэнцыі, у пісьменьніцкай рэмарцы.

Усе гэта элемэнты, што могуць пры гадзіцца пры крытычнай пераапрацоўцы формы для нашай літаратуры сацыялізму. Нельга дэкрэтаваць формы і на аснове толькі фармальных нахілаў пісьменьніка нельга рабіць высновы пры яго адсталасьці ці яго дасягненьні.

Адзіным крытэрыям тут застаецца зьмест. «Старыя формы лопнулі, бо аказалася, што новы зьмест у іх... дасягнуў непамернае разьвіцьцё. У нас ёсьць цяпер з пункту гледжаньня разьвіцьця міжнароднага камунізму, такі трывалы, такі моцны, такі магутны зьмест працы (за савецкую ўладу, за дыктатуры пралетарыяту), што ён можа і павінен выявіць сябе ў любой форме і нават і старой (падкрэсьлена намі—Х. Д.), можа і павінен перарадзіць, перамагчы, падпарадкаваць сабе ўсе формы, ня толькі новыя, але і старыя,—не дзеля таго, каб са старым паміріцца, а дзеля таго, каб умець усе і ўсялякія, новыя старыя формы зрабіць арудзьдзем поўнай і канчатковай і беспаваротнай перамогі камунізму» (Ленін «Дзіцячая хвароба «лявізны» у камунізьме», апошні разьдзел).

Кульбак павінен так перабудавацца, каб працуючы на матэрыяле Кастрычнікавай рэвалюцыі ды ў духу савецкай улады, яго фармальная і тэхнічная кваліфікацыя падпарадкавалася рэвалюцыі, ператваралася ў сапраўдную зброю за поўную перамогу камунізму. Кульбак павінен рашуча пайсьці па гэтаму шляху.

З яўр. мовы З. Бядуля.

Яўрэйскія пісьменьнікі БССР Харык, Аксэльрод і Кульбак разам з яўрэйскім паэтам Украіны І. Фэфэрам

Эрых Вайнэрт

Сьвяты канец Густава Кульке

Густаў Кульке, 'шчэ пры кайзэры
Вільгельме,
Спрытны шуцман быў, якіх цяпер
няма.
Ён па вуліцах любіў імчацца вельмі,
Асабліва з шабляю на першы май.
Ён любіў запал адважнае атакі.
І лушчыў патылкі, як ванцак,
Бо ён быў гэрой найлепшай маркі,
Бо ён быў сапраўднейшы прусак.
А як прыйдзе тыдзень узнагароды
Густаў Кульке радасны ідзе.
— Уласнаручна начапіў гэрою ордэн
Пане, паліцэйскі прэзыдэнт.
Але—ах. Дзе Кайзэр. О, якая драма.
Густаў Кульке вылящеў далоў.

Ён стаіць ля Брандэнбургскай брамы,
З гора зрэнкі вылезьлі на лоб.
І тады купляе будку з півам
Нумар драй на Крумэльштрасэ ён,
Успамінае дні імпэрыі шчасьлівай
І паліцыі зялёнай шле праклён.
Але— ах. Як першы май прыходзіць
Чысьціць шаблю ён зьнемоглаю рукой.
І калі са сьцягамі праходзяць
Увесь дрыжыць, нібы салдацкі конь.
Ох, жыцьцё цяпер—адна хвароба
І гарэлку з гора п'е Густаў.
І аднойчы пасьля добрай спробы
Лёг Густаў і больш ня можа ўстаць.
Ціхая душа ад гэткай нагрузкі
Захацела ў прочкі, а як раз быў
першы май.
І пачуў Густаў загад знаёмы, прускі:
— Усьцяж вуліцы паліцыя страляй.
Ах.—І задрыжэла яго сэрца,
Як загад ў газэціне знайшоў.
І Густаў сказаў:—«Кайзэр мой ізноў
встанецца,
Бо дух прускі тутака ўжо».
І схапіў з надзеяю на перамогу
Шаблю ў апошні раз Густаў.
І ўпаў на ложак, і з усьмешкай ціхай
богу
Паліцэйскі шчыры дух аддаў.

Пераклад з нямецкае мовы
А. ЗАРЫЦКАГА.

Ансамбль народных інструмантаў у Закаўказьзі

Беларускі Дзяржаўны Ансамбль Народных Інстытутаў пад кіраўніцтвам Жыдовіча—адзінка па гадох існаваньня маладая, але ўжо мае багатую гісторыю работы і службы на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва. Кожны год ансамбль выкананьнем на беларускіх народных інструмантах нясе народную песьню, творы савецкіх кампазытараў, у тым ліку і беларускіх, ня толькі ў працоўныя масы БССР, але і ў другія савецкія рэспублікі. Летам 1931 году ансамбль выступаў у Гомельшчыне і на Украіне, у Харкаве, Данбасе, сярод гарнякоў Сталіна, Алчэўска, Луганска і інш.

У гэтым годзе дзяржаўны ансамбль з удзелам салістых беларускай дзяржаўнай студыі опэры Дзянісава і Андруковіча быў накіраваны НКА БССР у Закаўказьзе.

Выезд ансамблю ў ЗСФСР—першы здказ БССР на прыезд мастацкіх адзінак Закаўказкіх Рэспублік у савецкую Беларусь, першы паказ беларускай народнай творчасьці, беларускай культуры працоўным Закаўказьзя.

Партыйныя, прафэсыянальныя і грамадзкія арганізацыі савецкай Грузіі і гораду Тыфлісу аднесьліся з выключнай увагай да прыезду і наладжаньня работы ансамблю ў самых шырокіх рабочых гушчах (пры НКА Грузіі была створана камісія ў складзе: загадчыка культсэктару САпрофу Грузіі, тав. Гегенава (старшыня), старшыні галоўмастацтва Кандэлакі, прадстаўніка партыйнага камітэту Тыфлісу тав. Абхафэз, заслужонага артыста Урушадзэ і інш.). Да прыезду ансамблю ў друку было зьмешчана шмат заметак і артыкулаў ня толькі пра ансамбль, але і пра культурнае будаўніцтва БССР.

Прафэсар Яўгені Браўда, які знаходзіўся ў Тыфлісе, ў сувязі з прыездам ансамблю ў «Зары вастоку» (орган Закрайкому УсеКП(б) пісаў: «Прыгнечаная і абяздоленая ў пэрыяд царскага рэжыму, забітая «ускраіна Беларусь» цяпер адзін з фарпостаў савецкай культуры на самай заходняй мяжы нашага Саюзу... Беларускі дзяржаўны ансамбль народных інструмантаў, які зараз выступае ў Тыфліскіх рабочых клюбах, выконвае беларускія народныя песьні, песьні, ад якіх аддае сумам чалавека, ня маючага магчымасьці паказаць свае сілы пад прыдушэньнем сацыяльнага ўціску. Разам з гэтым аркестр выконвае шэраг бадзёрых, яскравых напеваў, у якіх адчуваецца маса нерастрачанай энэргіі, жыцьцёвай волі і ўпартасьці...

«Кантраст між беларускай песьняй і грузінскай у сваім музычным гучаньні надзвычайна моцны. Тым больш важна азнаямленьне грузінскай аўдыторыі з гэтымі абразкамі народнай творчасьці»...

Кожны концэрт ансамблю пачынаўся невялікім уступным словам пра культурнае будаўніцтва ў БССР. У Тыфлісе ансамбль даў трынаццаць канцэртаў у рабочых клюбах, сустракаючы ўсюды вялікую ўвагу і гарачы прыём. Апрача таго, ансамбль даў шэраг бязплатных выступленьняў у часе абедзенных перапынкаў на заводах: «Р. З.»—паравозны рамонты завод, чыгуначнікам станцыі Тыфліс і інш.

10-га жніўня ў адным з буйнейшых рабочых раёнаў у клюбе імя Сталіна адбыўся вечар сустрэчы грамадзкасьці савецкай Грузіі з прадстаўнікамі культуры БССР. Ва ўрачыстай частцы ансамбль віталі прадстаўнікі розных арганізацый, а прадстаўнікі ансамблю расказалі аўдыторыі пра гаспадарчае і культурнае будаўніцтва БССР, азнаёмілі з яе дасягненьнямі і перамогамі. Пасьля ўрачыстай часткі адбыўся вялікі канцэрт беларускай і грузінскай музыкі, народнай песьні і скокаў, дзе прынялі ўдзел лепшыя прадстаўнікі мастацтва савецкай Грузіі: заслужоны артыст Інашвілі, заслужоны артыст Урушадзэ, народная сьпявачка Таркнішвілі, прэм'еры балету Дзяржаўнага Опэрнага Тэатру і інш.

Пасьля Тыфлісу ансамбль наведаў горад Кутаіс, Аджарыстанскую рэспубліку, абхазскую рэспубліку і выступаў у санаторыях Сочы-Мацэста—ўсюды пакідаючы вялікае ўражаньне.

Закончыў ансамбль сваю работу канцэртам у УССР, у Адэсе. У знак прыезду ансамблю быў арганізаваны вечар сустрэчы грамадзкасьці гораду Адэсы з ансамблем ў вялікай залі Гарсавету. Прадстаўнікі культуры, кампазытары Адэшчыны, выказваючы свае ўражаньні пра канцэрт ансамблю, адзначалі вялікую мастацкую вартасьць выканаўцаў, як паасобных, так і ўсяго ансамблю. Кампазытары Данькевіч, Драгаміраў і інш. адзначалі беларускі ансамбль як адзінку па складу інструмантаў і мастацкім выкананьні ўсесаюзнага значэньня.

Асаблівай увагай і вялікім посьпехам карысталіся беларускія народныя сьпевы ў выкананьні артыста Андруковіча пад акампанімэнт дуэта цымбал, выступленьні артыста Дзянісава з выкананьнем клясычных твораў на беларускай мове, вакальны дуэт Дзянісава і Андруковіча з выкананьнем сучасных музычных рэчаў пад акампанімэнт усяго аркестру, дуэт цымбалістаў Жыдовіча і Ліпніцкага, «Лявоніха» у выкананьні аркестру і інш.

З твораў беларускіх кампазытараў ансамбль выконваў рэчы спэцыяльна напісаныя для ансамблю кампазытарам Аладавым—Рандо на беларускія тэмы, Івановым—Татарская фантазія, невялічкія рэчы Любана, Гелера і інш.

А.

Выступленьне т. Чумандрына

--праявы раппаўскай групаўшчыны

Заява тав. Чумандрына, кіраўніка б. Ленінградзкай асацыяцыі пралетпісьменьнікаў пра тое, што пасьля пастановы ЦК пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый і ліквідацыю ЛАПП творчае і тэорытычнае жыцьцё літэратурнага Ленінграду зацíхла, знайшла ўжо водгук на старонках цэнтральнай партыйнай і камсамольскай, а таксама і літаратурнай прэсы («Правда», «Комсомольская правда», «Литгазета»).

Выступленьне М. Чумандрына на прэзыдыуме Аргкамітэту ня было «прыкрай памылкай друку», памылкова фармуляванай. І зараз, калі гэтая дэклярацыя асуджана пісьменьніцкай грамадзкасьцю, групаўшчыкі ў запале гатовы сьцьвярджаць, што нібыта друк перакруціў прамову Чумандрына, што Чумандрын—ахвяра «злога паклёпу» і... групаўшчыны ў Аргкамітэце.

Выпіска з пратаколу паседжаньня прэзыдыума Аргкамітэту, якая падаецца ніжэй, кажа пра тое, што сэнс выступленьня тав. Чумандрына быў перададзены карэспандэнтам досыць правільна.

Вось што казаў тав. Чумандрын:

«Колькасьць творчай прадукцыі ў бягучае лета зьнізілася. Творчая актыўнасьць недастатковая. Творчае асяродзьдзе было расплывістым. Ня гледзячы на тое, што лета зьяўлялася самым зацішлівым у рабоце ЛАПП, трэба прызнаць, што ніколі творча яно ня было так нездавальняюча, як сёлета. Работа «замарожана». Нельга агульна асуджаць рапаўскія лёзунгі. Усе творчыя лёзунгі РАПП ня толькі не асуджаны, але і не абмяркованы. Творчая дыскусія не разгорнута. Аргкамітэт ігнараваў творчыя пытаньні. Спроб асэнсіваньня творчай практыкі было менш, чым калі-небудзь у іншае лета. У Аргкамітэт будзе заяўлена шэрагам таварышоў, ад якой спадчыны РАПП мы не адмаўляемся».

Выступленьне М. Чумандрына выклікала пратэсты іншых удзельнікаў паседжаньня—т. т. Сьвірына, Лаўрэнева, ды інш.—паказаньнем на творчую прадукцыю ленінградзкіх пісьменьнікаў, якія абвергі заяву М. Чумандрына. Таварышы кваліфікавалі яго выступленьне, як выступленьне, накіраванае супроць пастановы ЦК. Тады тав. Чумандрын пасьпяшаўся абвінаваціць сваіх крытыкаў у «групавых меркаваньнях». Астатнія члены Аргкамітэту—Слонімскі, Казакоў, ды інш.—вымушаны былі выступіць супраць і гэтага абвінавачаньня тав. Чумандрына.

Выступленьне тав. Чумандрына—ня выпадак. Іншыя б. лапаўцы, якія групуюцца вакол Чумандрына, рэалізуюць яго тэзісы ў практычнай рабоце. Мы маем шэраг фактаў, якія гавораць пра лінію супрацьдзеяньня аргкамітэту, пра спробы зьмяншэньня аўтарытэту Аргкамітэту, яго дыскрэдытацыі, правадзімых загадчыкам ЛенГІХЛ тав. Горэвым. Пасьля таго, напрыклад, калі былы орган ЛАПП, часопісь «Ленинград» перашоў у Аргкамітэт, пасьля таго, як Аргкамітэт вынес пастанову пра яго захаваньне, але ў той-жа час абнавіў рэдакцыю часопісі і патрабаваў яго перабудовы, тав. Горэў правёў на праўленьні ЛенГІЗ пастанову пра закрыцьцё гэтай часопісі. Праўда, пастанова, вынесеная бяз ведама Аргкамітэту і нават бяз ведама партыйных арганізацый, была скасована. Характэрна матывіроўка тав. Горэва, які заявіў, што ў сучасны момант Ленінграду досыць аднэй часопісі. Ці не перагукаецца гэтая заява з заявай тав. Чумандрына пра творчае зацішша?

«Ленінград» працягвае існаваць, але яго перабудова, вызначаная Аргкамітэтам, адкравенна тармозіцца кіраўніцтвам ЛенГІХЛ, якое затрымлівае кожнае мерапрыемства па палепшаньні часопісі. Дзякуючы тав. Горэву быў затрыманы, напрыклад, верасьнёўскі нумар часопісі з матар'яламі да юбілею М. Горкага.

Ня менш яскравым зьяўляецца факт звальненьня без усякіх прычын адказнага рэдактара часопісі «Залп» тав. А. Дмітрыева, аднаго з актыўнейшых работнікаў Аргкамітэту, які, да слова, зьяўляецца членам брыгады пісьменьнікаў, якая абсьледвала работу ГІХЛ. Звальненьне А. Дмітрыева адбылося бяз згоды кіруючых арганізацый і матывавана заявай пра... «асабістае жаданьне Дмітрыева». Але справа ў тым, што тав. А. Дмітрыяў даведаўся пра сваё звальненьне з вывешанага загаду Горэва.

Пададзеных фактаў досыць. Некаторыя былыя работнікі ЛАПП спрабуюць ахаяць кіраўніцтва Аргкамітэту, намагаюцца перашкодзіць яго рабоце, намагаюцца перашкодзіць далейшай перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый Ленінграду.

Г. Максімаў.
(«Литгазэта»).

Я. КОХАН

Вайсковыя песьні

1. На вайну чужую...

Мацеркі перад дзядмі за тыдзень
штогад ссушвалі на сухарыкі
не адну кулідзіну ці скрыдзель,
а й свае траскатыя твары.

Штогод у заклятую нядзелю
да зьвідненьня ранечечка
мацеркі ня спалі,
не сядзелі—
блыталіся,
што параненыя.

Бацька ўпрэгае каня:
— «Трэ' ехаць мо'»?
сын-жа, хоць ужо адзет, абут:
паварочваецца ат, як зьнехаця,
бы перад навальніцаю дуб.

Маці кідаецца вобсаць ніцма:
— Ды калі-ж, сынок, да нас—
у госьці?—
«Калі вырасьце травіца
у нашых сенечках на памосьце».

— Ды чаго-ж ты, сынчык мой,
ня тойся—
панясеш сваю голаў і плечы
на вайну чужую,
як на той сьвет,
пад гарманскі-ы-я мечы.

Лепей-бы цябе якім калекам
выцягла са свае вантробіны,
чымсьці з пад царовае прыйсьці
апекі,
як твой бацюхна,
з нагой прыробленай...

І яшчэ-ж ніяк ён не раскрывіцца,—
даматур спрадвечны
на мае-э-х сьлёзы.
гэта-ж на вайне яму зьбіў сківіцу
злы пагоньнік, што ня так—пад
козыр...»

— Ня плач, матухна,
ня плач пры мне—
без мяне наплачашся даволі,
як ня ўбачыш больш ніколі
у чужадальнай старане.

І ня плакала ўжо ні пры,
ні бяз сына
маці песьняю вільготнай
у Кастрычніцкую часіну,
на дзяды семнаццатага году.

2. На разьбезе маршрутаў

... І цупляшкі мільганьнем рэжуць
вочы,
як прысакам.
У пачлушках—грубкі
з дзяснамі цынгавымі
агню

от ня грубкі
між абцёпканымі шынэлёвымі
крысамі
праваднік,
зьнявелы сівізнай,
На гурт узмагнуў:
— Шчо, жовнэрыкі,
тутэчка вы вжэ в останны,
так сказаць,
відслужылыся, ідэце
вжэ спочыты на спокіі
та домуваты?..

І па бывалешняму на растанкі
ноч выставіла
вялізазны коўш Мядзьведзіцы,
повен сьвежасьці ядранай,
надзеленкаватай.

Шлём на бакір—
устаў алутлаваты чуваш
з цеснага гурту
таварышаў сваіх:
— Ету на вэтрапфак ў Маскву,
кашучы між вас,
ягва тастаў места—
поўна-ш такіх.

— Ой, ды дальняя даро-о-ога...
Хутчэй-бы толькі,—
між сяброў нараспеў
прагаварыўся Даўмат—
у Бабруйсак узлумаў
да сястры камсамолкі—
што пайшла ў адыходнікі на
канбінат..

І
на разьбезе маршрутаў—
багацейшых мейсцаў—
ад паўстанкаў
да станцыяў,
гарадоў і сяліб
ня сьціхае з гармонікам
гоман жывы.
Гэта імкнуцца
ў прагалы Савецкай зямлі
з варашылаўскай школы—
чырвонаармейцы—
палітрукі ўскраін
куткоў лесавых.

У БДзТ-3

На дванаццатым годзе існаваньня Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам народнага артыста Галубка згодна пастановы Калегіі НКА пераіменаваны ў БДТ-3 і накіраваны для працы ў г. Віцебск.

Вялікая і складаная задача была пастаўлена перад тэатрам. У тэатры ня было аркестру, ня было адпаведных п'ес, адсутнічалі некаторыя цэхі (электрычны, кравецкі). І вось на новым месцы з малымі матар'яльнымі сродкамі, тэатр са старым вопытам разгарнуў працу.

Набываецца аркестр, афармляюцца цэхі, запрашаюцца лепшыя мастакі, адчыняецца сэзон прыгожа афармленай п'есай «Энтузіясты».

Разам з працай у тэатры, калектыў шырока разгортвае працу па-за тэатрам, прасоўваючы мастацтва сярод працоўных гушч, шляхам культвылазак і дакладаў (21 вылазка на заводах, 32 даклады па ўсіх школах ФЗУ у г. Віцебску).

Тэатр усюды сустракае вялікую прыхільнасьць, а разам і зацікаўленасьць да самога тэатру.

Арганізаваны глядач у тэатры заўжды ёсьць.

Чарговай пастаноўкай тэатр выпушчае п'есу Курдзіна «Контратаку».

Аўтар Курдзін спэцыяльна напісаў гэту п'есу для БДТ-3, каб тэатр яскравей і глыбей паказаў вайсковую небясьпеку, мацней адбіў пралетарскую сутнасьць Чырвонай арміі, мастацкі паказаў узаемадзеяньне трох аграмадных сіл: рабочых, калгасьнікаў і чырвонаармейцаў.

Ставячы гэту лепшую п'есу, тэатр на вачах рабочага гледача расьце і мастацкі і ідэалёгічна.

Прарабіўшы значную працу сярод Чырвонай арміі, тэатр пераяжджае з г. Віцебску на раёны.

На працягу 1 з пал. месяцаў тэатр працуе ў Белдрэсе, Асінторфу, Дуброўне, Воршы (чыгунка-горад), Чашніках (фабрыка-мястэчка), Лепелі—лягерах, абслужыўшы 50 т. рабочых, калгасьнікаў і чырвонаармейцаў.

БДзТ-3 працуючы як у г. Віцебску, так і ў падарожжы па раёнах, заваёўвае сабе шлях да такога мастацтва, якое мы завем пралетарскім па зьмесце і нацыянальным па форме.

Бясспрэчна тэатрам зроблена яшчэ ня ўсё. У яго рабоце ня мала недахопаў, але пры напружанай працы калектыў зьліквідуе свае памылкі.

У сучасны момант тэатр знаходзіцца ў адпачынку і з 10 верасьня распачынае працу ў г. Гомлі.

Мастацкім кіраўніком тэатру будзе т. Міровіч, які даў згоду павесьці працу ў маладым калектыве.

Першая пастаноўка даручана тав. Міровічу.

Можна спадзявацца, што калектыў БДТ-3 з новага сэзону з папоўненым штатам артыстых і мастацкім кіраўніком тав. Міровічам стане яшчэ на вышэйшую ступень мастацтва і з наступнага 1933 году пакажа свой рост працоўным т. Менску.

Горскі.

Супраць халтуры

Прайдзеце па Савецкай ці Ленінскай, і ня толькі ў Менску, але і ў Віцебску, Гомелі, Барысаве і інш. гарадох Беларусі, паглядзеце на пышныя» вітрыны БАКТ'а і інш. магазыны, што гандлююць культурнымі таварамі, вы ўбачыце «прыгожа» растаўленыя, расфарбованыя статуэткі, якія завуцца масавай мастацка-выяўленчай прадукцыяй, прызначанай для ўпрыгожаньня рабочых кватэр.

Прыглядзецеся ў гэту сапраўды халтурную прадукцыю—(твар статуэткі «камсамолка», твар, які нагадвае хутчэй гандлярку, а ня тып бадзёрае, поўнае энтузіязм і жыцьця камсамолкі — ударніцы, якая перавыконвае прамфінплян. Узброены з галавы да ног, у чаркескай бурцы з арліным і злым поглядам, але са шлёмам і зоркаю, чалавек з герояў тыпу «Кузьмы Кручкова» якому варта перамяніць толькі галаўны ўбор і ён з аднолькавым посьпехам будзе падобны і да белагвардзейца, і да польскага афіцэра і да бандыта з шайкі «бацькі Махно».

Чаму нашы рабочыя і работніцы, будаўнікі сацыялізму ў гэтых статуэтках трактуюцца як брудныя, абарваныя жабракі, як самазадаволеныя людзі, якія ўсё ні па чым.

Ці-ж перапоўненыя паліцы і вітрыны магазынаў гэтымі шаржыраванымі халтурнымі статуэткамі камсамолак, піянэраў, рабочых, чырвонаармейцаў, сялян з тыпаў. старых ілюстраваных рускіх песеньнікаў: «Ухарь купец» і «Ямщик, не гони лошадей» могуць упрыгожыць рабочую кватэру?

Ці-ж гэтыя таўстамордыя вобразы камсамолак не карыкатура, ня зьдзек над камсамолам? Ці-ж такія трактоўкі герояў і героікі нашых дзён ЦК ня прызнаў контррэвалюцыйнымі?

Прыгледзьцеся яшчэ да ілюстрацыі часопісаў кніжак, вокладак, да дзіцячай цацкі і г. д.

Час мастацкім арганізацыям павесьці барацьбу з халтурай ва ўсіх відах выяўленча-мастацкай прадукцыі. І не абходна чыстка гатовай прадукцыі, неабходна ўзмацненьне контролю над новай прадукцыяй, якая выходзіць з работы.

Чаму да гэтага часу няўмешваецца саюз работнікаў мастацтва і другія арганізацыі? Патрэбна падняць якасьць масавай прадукцыі!

А. Левін.

Спыніліся на поўдарозе

Да сярэдзіны лютага пг. ў Магілеве ня было арганізаванага літаратурнага руху. На ўвесь горад, дзе налічваецца каля дзесяці тысяч прамысловага пралетарыяту, і значная колькасьць навучальных устаноў, у тым ліку тры ВНУ, існаваў усяго адзін літгурток пры пэдінстытуце, ды і той быў замкнуты ў сваіх сьценах.

Прыезд брыгады БелАПП'у ў лютым, на чале з тав. Барашка, выклікаў значны зрух. Брыгада наведала прадпрыемствы, дзе выявіла пачынаючых пісьменьнікаў і паэтаў, зрабіла шэраг масавых дакладаў аб працы БелАПП'у і заклiку ўдарнікаў і літаратуру. Быў склікаць агульна-гарадзкі зьлёт літаратурных сіл і абрана аргбюро МагАПП-у на чале з рэдактарам «Камунар Магілеўшчыны» тав. Пятровым.

З таго часу разгарнулася некаторая праца. Прыступілі да выданьня літстаронкі пры райгазэце, правялі заклік у літгурткі на прадпрыёмствах, дзе былі скліканы спэцыяльныя сходы рабкораў і пачынаючых літаратурных сіл. Бюро РК КП(б)Б вынесла спэцыяльную пастанову пра разгортваньне літаратурнага руху на Магілеўшчыне, абавязала райпрафсавет, райАНА, фабзаўкомы, разгарнуць заклік ударнікаў і літаратуру, наладзіць сталую літаратурную вучобу на прадпрыемствах.

Але ня гледзячы на тое, што ў памянёнай пастанове быў спэцыяльны пункт пра праверку яе выкананьня, праз месяц, бюро РК гэтага не зрабіла і фактычна паклала яе пад сукно пасьля ад'езду брыгады пісьменьнікаў. РПС і фабзаўкомы, якія павінны былі разгарнуць заклік ударнікаў у літаратуру, забясьпечыць рэгулярныя літаратурныя заняткі на прадпрыемствах, гэтага не зрабілі. РайАНА таксама ня выканаў свайго абяцаньня вылучыць настаўнікаў літаратараў для кіраўніцтва літгурткамі, ні водзін з якіх не распачаў працы і да гэтага часу.

Замест рэгулярнага штомесячнага выданьня літстаронкі—«Камунар Магілеўшчыны» выпусьціў яе ўсяго два разы. Не наладжана літкансультацыя для пачынаючых паэтаў і пісьменьнікаў, якія ёсьць на шоўкавай фабрыцы імя Куйбышава, чыгуначным вузьле, швэйнай фабрыцы імя Валадарскага, ды інш. і вымушаюць працаваць без усякага кіраўніцтва і дапамогі.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове літаратурных арганізацый павінна была зьявіцца моцным штуршком, для разгортваньня работы. Мясцовыя арганізацыі —Райком КП(б)Б, культсэктар Райпрафсавету і рэдакцыя ня здолелі яе скарыстаць, а таксама прыезд брыгады БССП на чале з тав. Галавачом, для таго, каб перайсьці ад слоў да справы і наладзіць нарэшце літаратурную справу.

Райком камсамолу таксама бязыдзейнічае і ўвесь час стаіць з боку гэтай справы. Патрэбна разварушыць магілеўскія арганізацыі і разгарнуць работу ў адпаведнасьці з пастановай ЦК УсеКП(б).

Магілеў мае ўсё магчымасьці для значнага разьвіцьця літаратурнага руху і арганізацыі філіі Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў. Ёсьць некалькі паэтаў і крытыкаў імёны якіх вядомы паза Магілёвам (Гаўрук, Журба, Фэлін, Гутараў). Растуць кадры пачынаючых пісьменьнікаў і крытыкаў (Гокатаў, Кухэраў, Зарніца, Крывічны, Рыбакоў і інш.), якія ўжо вылвілі сябе на старонках мясцовага друку.

Я. Слевін

Ц. Доўгапольскі

У ЛІПЕНІ МЕСЯЦЫ

Фрагмэнт п'есы

ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ:

Какараў, Назар, рабочы з папяровай фабрыкі, мае ўласны дом, малую гаспадарку, папулярны сярод старэйшых рабочых, 43 год.

Зося, дачка Кокарава, камсамолка, трактарыстка, 19 год.

Васілёк, сын Кокарава, 14 год, піянэр.

Гросаў, стажор, яшчэ ня скончыў хім-тэхнікуму, знаходзіцца на чале брыгады, пасьля дырэктар фабрыкі, камуніст, 25 год.

Хаікаў, былы бяспрытульны, культпрацаўнік, камсамолец, 23 г.

Філатава, кіруе культ-сэктарам, па сьля старшыня фабкому, камуністка, 23 год.

Дыдрык Ласоўскі, сын былога гаспадара фабрыкі, цяпер замежны інструктар, 40 год.

Змрок, кіраўнік справамі фабрыкі.

Саўкін, загадчык гаспадаркай

Марта, гутарлівая, адсталая работніца, пад яе ўплывам знаходзяцца адсталыя жанчыны рабочага пасёлку.

Дунькіна, Марыля, Пічужына, Генджыкава, працуюць на фабрыцы і маюць свае гаспадаркі. Абраз першы.

Глухая маленькая чыгуначная станцыя. На заднім пляне цэнтральная частка драўлянага вакзальчыка, па сярэдзіне дзьверы, па бакох вокны, маленькая старая шылда «Ласоўская». На пляцформе вялікае ажыўленьне. Некалькі чалавек у дыяганальным кірунку перасякаюць сцэну. Рабочыя—мужчыны і жанчыны, апранутыя па летняму, чыста, як у выходны дзень, групамі і парамі спацыруюць туды і сюды, чакаюць цягніка. Чутны далёкія жніўныя песьні, даходзяць гукі аркестры.

Пляцформа акроплена заходнім сонцам. Усё бліжэй і ярчэй чуваць пыхканьне лёкаматыва. Людзі пакідаюць сцэну і ўсе накіроўваюцца ў той бок, адкуль ідзе цягнік.

На сцэну зьяўляецца худзенькі, жвавы і рухавы Хаікаў з фотаапаратам пры боку. З ім Дыдрык-Ласоўскі —чыста паголены, гладка прычэсаны; у батфортах.

Хаікаў (прыступае да фатаграфаваньня. Мабыць хоча сфатаграфаваць вакзальчык). Зьбіраю фотоматар'ялы па гісторыі фабрыкі. Іх замэльфотоматэр'ялы цу дэр гешыхтэ фон рэд папір-фабрык.

Дыдрык-Ласоўскі (ледзь выгаворваючы, чытае шыльду).

Ля-зоф-ская.

Хаікаў (настаўляючы апарат) Я—я... Ласоўскі... прозьвішча—фамілія старога... гаспадара.

Дыдрык-Ласоўскі (не разумее) Старо-хга ха-спа-да-ра? Вас?

Хаікаў, я—я... альтэр эйгентымэр.

Дыдрык-Ласоўскі, фэрштэндыхі—понімаль. Ніхт фьёаа німаль. А хто, вэр іст еш хгас-па-дар?

Хаікаў Іх—я гаспадар (спыняе працу, гаворыць рукамі), мы ўсе—мір альле—гаспадар, мы ўсе гаспадары.

Дыдрых-Ляхоўскі, шэнкен зі мір айнэ копіе фун фото —міне копія фото. Понімаль? (лопае яго па сьпіне) зі зайнэн айнэ іюдэ? ефрэй?

Хаікаў. Пытайцеся ў маей маці. Фрэген зі ба дэр мутэр. Памёрла ў дваццаць першым—гештарбен ін эйнунцванцык.

Дыдрык-Ласоўскі, га-га-га... Віціг, віціг.

Хаікаў. Іцік шпіцік... Ёсьць такая песьня ў старых—лід ба альтэ лайтэ...» нарыш—глупства... рыхтуемся да кастрычнікавых сьвят—актябэрфайеруоген (адыходзіць).

Дыдрык-Ласоўскі (спыняецца, няўпэўнена, пільна аглядаецца і гаворыць сам з сабою добрай рускай мовай) Ласовская... і вывеска уцелела.

Хаікаў (фотографуе з другога пункту). Вы гаворыце па-руску?

Дыдрых-Ласоўскі, эйн цындхальдэхэлыг хабэн зі? (абодва закурваюць).

На пляцформу зьяўляецца Кокараў. Па абодвух бакох яго дзеці. З аднаго боку Вася—у піянэрскім гальштуку, з другога боку Маша—у камсамольскай вопратцы. Яны трымаюць яго пад рукі і не адпускаюць. Ім насустрач Хаікаў, робіць розныя гесты і не дае Кокаравым ісьці наперад.

Хаікаў. Бацька з дзеткамі... Кокараў, ты шмат мейсца займаеш у гісторыі фабрыкі. Маю дакумэнты Пан Ласоўскі, стары гаспадар катаваў Кокараўцаў... Ну, і лупіў скуру... Глядзі, Маша (яна глядзіць у сшытак).

Кокараў. Аднэй рукою лупцаваў, а другой, мой міленькі, падпісваў доўга тэрміновыя крэдыты, бярвеньне на хату, грошы на карову.

Хаікаў. Аднак лупцаваў.

Кокараў. Не гарачыся, міленькі мой. Яны даўно ў пекле смалу возяць— усе і каго лупцавалі, і хто лупцаваў. Не гарачыся.

Хаікаў. Але клясы тыя, каго лупцавалі і хто лупцаваў яшчэ жывуць.

Васілёк. Тата, памагуй... Клясы яшчэ жывуць.

Кокараў. Вытры нос... З усіх бакоў. І ў хвост і ў грыву.

Зося. Бачыш, тата, чытай. Кокараўцы... За кожнае бервяно Ласоўскі цябе лазою частаваў.

Кокараў. Вядзеце бацьку, агітуйце бацьку... Лупцавалі, не лупцавалі... Што ні дзень, то навіна, мае міленькія... буксірнікі.

Васілёк. Яны едуць сюды, тата! Едуць!

Зося. Васька больш за цябе ведае... Тата, выбяры сабе аднаго з буксірнікаў, малайца якога, а мне пара на працу. Трактар чакае. А ты, Хаікаў, раскажы бацьку як Ласоўскі лазою частаваў.

Хаікаў. Трымалі за ногі, трымалі за галаву.

Кокараў. Скажы мне, Хаімка, міленькі мой, дружары і газэтчыкі едуць сюды, каб на буксір браць... Я іх за тры мілі не дапушчу да новага мэханізму.

Васілёк. Тата, тата, да старога мэханізму. Яны возьмуць на буксір стары мэханізм.

Кокараў. Чаго языком мелеш.

Васілек. (Стукае пальцам у бацькаў лоб). Вось гэты мэханізм, тата! Гэты мэ-ха-нізм.

Кокараў. Па-цук.

Хаікаў. Васька, шануй бацьку... (Кокараву). Ты нясеш адказнасьць... Памяшканьні для гасьцей, начлег для гасьцей, у сваю хату бярэш двух буксірнікаў.

Кокараў. Аднаго, Хаімка, аднаго.

Хаікаў. Ты-ж гаварыў—двох.

Кокараў. Аднаго... (стукае сабе пальцамі ў лоб). Гэта мой мэханізм буксірнік возьме на буксір?.. А машынай хто кіруе—ці-ж ня мой мэханізм? Хлапчукі вы хлапчукі, што вы сабе думаеце? Эх, міленькія! Пішаце гісторыю і ня ведаеце, што пад вашымі капытамі робіцца.

Праходзіць Філатава, побач—Марта, Марыля, Генджыкава, Дунькіна, Пічужына.

Філатава. Я с на... Рабочыя суткі цэлыя на торфе працавалі, для нашай фабрыкі торф грузілі... дык трэба іх сустракаць? А начлег ім даваць трэба?

Марта. Пайсьці пасустрач з хлебамсольлю.

Марыля. Я ткі ўзяла з сабою (выцягвае з фартуха пару сыроў).

Марта. Для буксірнікаў?

Дунькіна. І яечкі.

Марта. Пафарбуй іх... ха-ха-ха.

Генджыкава. А я (паказвае фігу).

Філатава. Сорамна, Генджыкава.

Марта. Нас, Філатава, мала абыходзіць, калі будуць паліць і вугольле... Завошта сыр—яны грузілі торф? А камены вугаль? Мала там нашых да Данбасе... І нашыя вёскі паслалі тўды, у-га-а, колькі новабранцаў.

Філатава. На што іх мобілізавалі?

Марта. Бо я ведаю? У мяне пытаюцца?

Філатава. Даўней машыны прывозілі з-заграніцы, вугольле таксама з-заграніцы, а цяпер у нас свае машыны і свае вугольле... Ясна?

Марта. А мне што ад гэтага?

Хаікаў, (асьцярожна, аглядаецца). Мартачка, родненькая, калі можам з табою спаткацца? Добра было-б у клюбным садзе, на доўгай лаве каля рэчкі... (цёмна). Хачу з табою пагаманіць пра торф і вугаль, і ліквідаваць тваю адсталасьць.

Марта. (Абымае яго рукамі). Сірапінка, бедненькі. бяспрытульненькі. Вазьму цябе на буксір і малачком напаю. Прыходзь.

Я мужычка-невялічка,
Ты з яўрэяў-добрадзеяў,—
Не станчуеш драпака,
Не дастанеш малака.

Хаікаў. А буксірніка прычэпіш?

Марта. Занятт гонару для мяне.

Філатава. Марта прапалая.

Хаікаў. Псміні, Філатава. Ідзея сустрэчы з падарункамі рабочых і разьмяшчэньне буксірнікаў па нашых кватэрах належыць мне, Хаікаву.

Філатава. Чулі ўжо, чулі.

Хаікаў. Га? Што? Нічога? Загартоўваць чалавека ў глыбінях рабочага быту (абодва адыходзяць).

Пляцформа абліта заходнім сонцам. Нейдзе далёка пяюць жніўныя песьні. Грае гармонік. Трубіць пастух. Рыкаюць каровы. Усе гэтыя гукі глушыць аркестра, што чутно ўсё бліжэй. Лёкомотыў пыхкае цяжка і шпарка.

Марта. Бабы! К чорту буксірнікаў! Стада ідзе... Каровак даіць!

Вось буксір мой гэткі—
Кароўкі пад паветкі.
А з торфу падшывальцам
Дулачкі з трох пальцаў.

Хадзем, бабанькі, хадзем! (Марта адыходзіць, за ёю грамадка жанчын).

Змрок. Марта—сіла!

Саўкін. Антрацыт. Вось гэта я разумею... Маўчок (далоньню затуляе рот).

Змрок. Знайшоў Амэрыку!

Саўкін. Бо заўтра фабрыка будзе стаяць (далоньню затуляе рот).

Змрок. А эшалёны торфу? А буксір?

Саўкін. Вільготныя... Грузілі з вільготных штабалёў (дробныя сьмяшкі).

Змрок. (сьмяецца). Хто-ж тут вінаваты?

Саўкін. Ні я вінаваты, ні ты вінаваты... Рабочыя? Што рабочыя... шугаюць у карак, дык ідуць. Мокры штабэль бліжэй—капаюць, бяруць (абодва сьмяюцца, кожны на свой лад).

Гросаў—успацелы і вымазаны кідаецца на сцэну, нібы ён выскаквае з таварнага вагону.

Гросаў. Таварышы папернікі! На такое спатканьне мы не спадзяваліся. Таварышкі сустрэлі нас з сырамі, булачкамі і яечкамі... Гэткае спатканьне (нешта з кішэні кладзе ў рот, жуе поўным ротам, чакаюць, пакуль ён глыне ды зноў гаварыць пачне). Нам сказалі, нас напалохалі, што папернікі і халоднай вады не даюць, але мы да вас прышлі, адпрацавалі дзень на торфе... а цяпер... Мы вызначаем таварышоў, бярэм фабрыку на буксір, на буксір.

Кокараў (сьцягвае Гросава з лесьвіцы). Годзе, таварышы глотку псаваць.

Зося. Перастань, тата, перастань!

Кокараў. Ненавіжу слова «буксір»... Ня я абсмлеў, ня ты нашатыр... Вася, паклін яго да нас... Работніцы, выбірайце сабе кавалераў, а вы, рабочыя, не засаромце прыежджых работніц (заўважыўшы маладую дзяўчыну, бярэ яе пад руку). Хадзем, не глядзі, міленькая, што я барадаты, я малады (пучна). Марыля, Генджыкава, Дунькіна, Пічужына, выбірайце буксірнікаў!

Хаікаў узлажыў на мяне адказнасьць, ха-ха-ха.

Адказны радактар Х. ДУНЕЦ

РЭДКАЛЕГІЯ: А. Александровіч, Ахрэмчык, В. Вольскі, Галкін, І. Гурскі, Х. Дунец, М. Лынькоў, Модэль, С. Нортман, М. Рафальскі, А. Рымшэўскі, І. Харык, К. Чорны.

Выдае Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі.

Друкарня імя Сталіна Менск

Упаўнаваж. Галоўліту № А—668